# Інвестарам у малых гарадах Беларусі будуць прадастаўляцца істотныя падатковыя прэферэнцыі

У Беларусі для новаствараемых у малых гарадах камерцыйных арганізацый, у тым ліку з замежнымі інвестыцыямі, прадугледжаны на 5 гадоў з дня іх заснавання пэўныя гарантыі ажыццяўлення дзейнасці і магчымасць не выплачваць асобныя падаткі і зборы. Адпаведны дэкрэт №1 «Аб стымуляванні вытворчасці і рэалізацыі тавараў (работ, паслуг)» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 28 студзеня. Палажэнні дэкрэта распаўсюджваюцца на населеныя пункты з колькасцю насельніцтва да 50 тыс. чалавек.

Для такіх арганізацый з 1 красавіка 2008 года прадугледжваецца магчымасць не выплачваць падатак на прыбытак у частцы даходаў, атрыманых ад уласнай вытворчасці, падатак на дабаўленую вартасць, мытныя пошліны і зборы за ўвозімае тэхналагічнае абсталяванне, прызначанае для ўзносу ў статутныя фонды арганізацый з замежнымі інвестыцыямі.

Пры гэтым у выпадку змянення заканадаўства, у тым ліку падатковага, для арганізацый, створаных у адпаведнасці з палажэннямі дэкрэта, на працягу 5 гадоў з дня іх заснавання захоўваецца права прымяняць заканадаўства, якое дзейнічала на момант іх стварэння. У мэтах забеспячэння больш прывабных умоў для гэтых арганізацый, у тым ліку з замежнымі інвестыцыямі, дэкрэт вызначае правы, якія дадуць магчымасць ім набываць сыравіну і камплектуючыя для ўласнай вытворчасці на свой выбар ад любых пастаўшчыкоў і па любых цэнах, прадаваць прадукцыю ўласнай вытворчасці на знешніх рынках па сваіх цэнах і на свой выбар, мінуючы абавязковыя біржавыя таргі і працэдуры дзяржаўных закупак і паставак. Арганізацыі таксама змогуць устанаўліваць паводле свайго меркавання заработную плату работнікаў, якіх наймаюць для вытворчасці тавараў на ўнутраны рынак рэспублікі, але не ніжэйшую за яе мінімальны памер, вызначаны ўрадам, страхаваць сваю маёмасць і рызыкі не толькі ў беларускіх, але і ў замежных страхоўшчыкаў.

Дэкрэт не будзе распаўсюджвацца на ігральны і латарэйны бізнэс, банкаўскую і біржавую дзейнасць, вытворчасць і рэалізацыю алкагольных напояў, тытуню, зброі і боепрыпасаў і некаторыя іншыя віды дзейнасці.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Беларусь гатова да прынцыповай каардынацыі сваёй знешняй палітыкі з Расіяй

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Расійскай Федэрацыі Сяргеем Лаўровым.**

«Я вельмі рады, што з часу Вашага папярэдняга візіту ў адносінах нашых краін нічога не змянілася да горшага, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Сяргея Лаўрова. — Наадварот, мы скарэкціравалі некаторыя моманты, у прыватнасці ў эканоміцы». «Я вельмі задаволены тым, як развіваецца супрацоўніцтва па ўсіх напрамках, у тым ліку ў палітыцы і ваеннай сферы. Сучасная сітуацыя ў свеце складваецца так, што інакш быць не можа», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Міністр замежных спраў РФ адзначыў, што расійскае кіраўніцтва таксама вельмі задаволена вынікамі двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Сяргей Лаўроў назваў канец 2007 — пачатак 2008 года часам «інтэнсіфікацыі палітычных кантактаў паміж дзвюма краінамі».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Урэгулявана дзейнасць ЖБК і гаражных кааператываў

**У Беларусі ўстаноўлены парадак стварэння і функцыянавання арганізацый забудоўшчыкаў, гаражных кааператываў і кааператываў, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак. Акрамя таго, вызначаны парадак уліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў месцах захоўвання транспартных сродкаў.**

Адпаведныя нормы змяшчаюцца ва Указе № 43 «Аб дзейнасці арганізацый забудоўшчыкаў, гаражных кааператываў і кааператываў, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак». Указ падпісаў 28 студзеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Указам зацверджана некалькі палажэнняў: аб арганізацыях забудоўшчыкаў, аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў месцах захоўвання транспартных сродкаў, аб стварэнні і дзейнасці гаражных кааператываў і кааператываў, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак.

Нормы заканадаўства па такіх пытаннях, уведзеныя яшчэ ў 1984 годзе, на гэты час устарэлі і патрабавалі істотных змяненняў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Рэзідэнтам беларускіх СЭЗ гарантаваны на працягу 7 гадоў спецыяльны прававы рэжым падаткаабкладання

**Для рэзідэнтаў беларускіх СЭЗ ствараюцца дадатковыя спрыяльныя ўмовы пры рэалізацыі інвестпраектаў. Указам № 42 унесены дапаўненні і змяненні ў некаторыя ўказы па пытаннях дзейнасці свабодных эканамічных зон.**

Так, для рэзідэнтаў СЭЗ прадугледжваюцца гарантыі нязменнасці на працягу сямі гадоў спецыяльнага прававога рэжыму падаткаабкладання, а таксама гарантыі ўключэння выпускаемай імі прадукцыі на працягу трох гадоў у штогадова фарміруемы пералік імпартазамяшчальных тавараў, якія вырабляюцца рэзідэнтамі СЭЗ і пастаўляюцца на ўнутраны рынак, у выпадку ўключэння такіх тавараў у гэты пералік у першы год выпуску прадукцыі. Акрамя таго, для рэзідэнтаў СЭЗ будуць прадастаўляцца льготныя ўмовы арэнднай платы (не больш як 2 працэнты ад кадастравага кошту, але не ніжэй за стаўкі зямельнага падатку) за зямельныя ўчасткі, якія прадастаўляюцца для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, ільготныя ўмовы падаткаабкладання.

Рэзідэнты СЭЗ дадаткова вызваляюцца ад выплаты падатку на нерухомую маёмасць і падатку на набыццё аўтамабільных транспартных сродкаў, ад адлічэнняў у інавацыйны фонд, які ўтвараецца Мінбудархітэктуры, і ад абавязковага продажу замежнай валюты на ўнутраным валютным рынку Беларусі. Дзяржава таксама акажа ім садзейнічанне ў фінансаванні будаўніцтва і развіцця аб'ектаў інфраструктуры, неабходных для рэалізацыі буйных інвестыцыйных праектаў. Таксама пашыраны паўнамоцтвы адміністрацый свабодных эканамічных зон. Указ уступае ў сілу з 1 красавіка 2008 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# У Беларусі перадаюцца ў канцэсію чатыры радовішчы карысных выкапняў

**Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў пералік аб'ектаў, прапануемых для перадачы ў канцэсію. Адпаведны ўказ № 44 Аляксандр Лукашэнка падпісаў 28 студзеня.**

Такімі аб'ектамі вызначаны радовішчы гіпсу «Брынёўскае», жалезных руд «Аколаўскае» і «Навасёлкаўскае», бентанітавых глін «Астражанскае». Перадача іх у канцэсію дасць магчымасць прыцягнуць замежныя інвестыцыі, асвоіць радовішчы карысных выкапняў і пабудаваць на іх базе вытворчыя магутнасці, стварыць новыя рабочыя месцы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## А. Кулічкоў назначаны кіраўніком мінскага прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы

Адпаведны загад падпісаў сёння Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Павел Барадзін, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў камітэце.

Чакаецца, што 1 лютага Павел Барадзін прадставіць Аляксандра Кулічкова на новай пасадзе.

# ПРАЦЯГ КУРСУ

Палеміка

## Якіх крокаў у адносінах да Беларусі можна чакаць ад Расіі пасля прэзідэнцкіх выбараў у суседняй краіне?

«Звязда» працягвае знаёміць сваіх чытачоў з меркаваннямі беларускіх палітыкаў і экспертаў адносна таго, як будуць развівацца беларуска-расійскія адносіны пасля выбараў у Расіі. Сёння мы прадстаўляем інтэрв'ю з былым прэм'ер-міністрам Беларусі Вячаславам Кебічам і намеснікам старшыні Камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Анатолем Красуцкім.

### Вячаслаў КЕБІЧ:
### «Беларусь для Расіі — гэта адзіны шлях на Захад»



***— Як вы ацэньваеце практыку прызначэння пераемніка на пасаду прэзідэнта Расіі?***

— У гэтым выпадку ёсць станоўчая рыса — захоўваецца пераемнасць курсу. Ці, прынамсі, няма рэзкай змены ў знешняй і ўнутранай палітыцы. Таму з гэтага пункту погляду я не бачу нічога дрэннага.

Калі ж да ўлады прыходзіць іншая асоба, то гэта можа пацягнуць розныя непрыемнасці. Дарэчы, а што тут новага адбываецца? У тых жа ЗША загадзя партыя вызначае кандыдата. Адрозненне толькі ў тым, што там існуюць партыі, якія змагаюцца. А ў Расіі сёння існуе адна партыя. Бо зразумела, што ніхто з іншых прэтэндэнтаў, якія паспрабуюць вылучыцца і «пакрасавацца» на выбарах, не маюць шанцаў.

***— З мінулага года Расія перайшла да выбараў у парламент толькі па партыйных спісах. Ці не лічыце вы, што Беларусі таксама варта было б перайсці да такой сістэмы?***

— Не. Бо мы не маем партый. У нас няма партый, якія цалкам склаліся, з дакладнымі платформамі. Скажыце, якая партыя сёння можа прэтэндаваць на месцы ў парламенце? Я не знаходжу ніякай партыі, якая магла б вылучыць спіс кандыдатаў.

***— Многія аналітыкі мяркуюць, што ў выпадку, калі Дзмітрый Мядзведзеў стане прэзідэнтам, а Уладзімір Пуцін — прэм'ер-міністрам, то апошняе слова пры прыняцці рашэнняў будзе ўсё ж за Пуціным. Ці згодныя вы з гэтым?***

— Я не спяшаўся б рабіць такія высновы. Гэта вельмі ўсё хістка. І дагэтуль гэта ўсё незразумела... Прэзідэнт ёсць прэзідэнт. І калі не будзе пераразмеркавання паўнамоцтваў, то гэта будзе так. Пры тых паўнамоцтвах, якія сёння мае прэзідэнт Расіі, апошняе слова будзе за ім. Якія сяброўскія ці іншыя адносіны не былі б паміж Пуціным і Мядзведзевым.

***— Як, на ваш погляд, могуць змяніцца адносіны паміж Беларуссю і Расіяй пасля выбараў?***

— Я не чакаю больш канфрантацыі, якая была.

***— Дзмітрый Мядзведзеў узначальвае савет дырэктараў «Газпрама»...***

— Хіба старшыня савета дырэктараў прымаў рашэнні па газу для Беларусі? Рашэнні па газу прымаюцца на самым высокім узроўні. Рашэнні па кошце газу і па ўзаемаадносінах паміж дзяржавамі... Апошнім часам узаемаадносіны паміж краінамі палепшыліся. І я, паўтару, не чакаю пагаршэння.

***— Якім вы бачыце лёс Саюзнай дзяржавы як інстытута пры Мядзведзеве?***

— Яна застанецца прыкладна такой жа аморфнай, як і сёння. Без зрухаў наперад. І без знішчэння гэтай структуры... У лепшы бок зрухаў не будзе.

***— Расійскія журналісты нядаўна актыўна абмяркоўвалі версію аб тым, што Уладзімір Пуцін мог бы ўзначаліць Саюзную дзяржаву. Гэта дало б яму магчымасць працягнуць свае паўнамоцтвы. Як вы ацэньваеце такі варыянт на будучыню?***

— Гэтага не будзе. Бо гэта не ўпісваецца ў палітыку, якую праводзяць кіраўнікі дзвюх дзяржаў. Не толькі Пуцін, але і Лукашэнка.

***— Ці застанецца пасля выбараў знешнепалітычная падтрымка Беларусі з боку Расіі такой жа моцнай, як была ўвесь апошні час?***

— Так. Іншага не дадзена. Бо Беларусь для Расіі — гэта адзіны шлях на Захад. Гэта своеасаблівыя «вароты ў Еўропу». Не будзе ж Расія прасякаць «акно ў Еўропу» немаведама дзе.

***— Ці працягнецца, на ваш погляд, будаўніцтва нафтаправода ў абыход Беларусі, якое пачалося пры Уладзіміру Пуціне?***

— Думаю, так. Бо ў гэтым зацікаўлена не толькі Расія. У гэтым зацікаўлена Заходняя Еўропа. Бо яна хоча мець альтэрнатыўныя крыніцы транспарціроўкі.

### Анатоль КРАСУЦКІ:
### «У палітычных і эканамічных адносінах будзе пераважаць рацыяналізм»



***— Як вы ацэньваеце практыку прызначэння пераемніка на пасаду кіраўніка Расіі?***

— Такая практыка існуе не толькі ў Расіі. У Еўропе кіраўнікі партый імкнуцца зрабіць так, каб іх пераемнікі сталі новымі кіраўнікамі дзяржавы. Таму з гэтага пункту гледжання сітуацыі аналагічныя.

Аднак у Расіі існуюць свае асаблівасці. Там партыя ствараецца пад канкрэтнага палітычнага дзеяча. А потым яна рэалізуе тыя ўстаноўкі, якія лічыць неабходным той ці іншы палітычны кіраўнік.

***— Хто ў Расіі пасля выбараў будзе больш уплывовым пры прыняцці рашэнняў: Пуцін на пасадзе прэм'ер-міністра ці Мядзведзеў на пасадзе кіраўніка дзяржавы?***

— Думаю, любы палітык не сумняваецца, што Пуцін будзе адыгрываць вядучую ролю ў палітычным жыцці Расіі. Незалежна ад таго, якія пасады ён будзе займаць.

***— Як могуць змяніцца адносіны Расіі і Беларусі пасля выбараў?***

— Паколькі ў кіраўніцтве Расіі захаваецца тандэм «Пуцін — Мядзведзеў», то думаю, у палітычных і эканамічных адносінах будзе пераважаць рацыяналізм, уласцівы зараз Расіі, якая развівае дзяржаўна-алігархічны капіталізм.

***— Ці можна чакаць паўтарэння нафтагазавых канфліктаў пры Мядзведзеве на пасадзе кіраўніка Расіі?***

— Усё залежыць ад таго, як мы будзем ацэньваць сітуацыю: як канфлікты ці пэўнае ўздзеянне на палітычнага партнёра. У любым выпадку, адназначна будзе адбывацца змяненне цэнаў. Гэта будзе залежаць не толькі ад сусветнай цэнавай кан'юнктуры на энерганосьбіты. Гэта будзе залежаць і ад палітычнай сітуацыі ў Еўропе і свеце.

***— Гэты год пачаўся без газавага канфлікту паміж Беларуссю і Расіяй. Ці можна меркаваць, што расійскі бок вырашыў не прыцягваць перад выбарамі ўвагу да кіраўніка савета дырэктараў «Газпрама» Мядзведзева?***

— Безумоўна, у дадзеным выпадку гэта быў немалаважны фактар. Бо канфлікт мог бы пэўным чынам негатыўна паўплываць на вынікі выбараў. І хоць вынікі выбараў вядомыя загадзя, перад расійскім кіраўніцтвам стаіць задача выйсці з максімальным паказчыкам.

Па-другое, не варта забываць і міжнародную сітуацыю, якая складваецца перад выбарамі. У тым ліку пытанні аб забеспячэнні бяспекі Расіі, размяшчэнне сістэм ПРА ў Заходняй Еўропе (фактычна на мяжы з Расіяй). Усё гэта, думаю, паўплывала на рашэнне Расіі не ствараць непатрэбных праблем з газам перад выбарамі.

***— Расійскія журналісты нядаўна актыўна абмяркоўвалі версію аб тым, што Уладзімір Пуцін мог бы ўзначаліць Саюзную дзяржаву. Гэта дало б яму магчымасць працягнуць свае паўнамоцтвы. Як вы ацэньваеце такі варыянт на будучыню? І як, на ваш погляд, будзе развівацца Саюзная дзяржава пасля выбараў?***

— Гады кіравання Расіяй Пуціным паказваюць, што прарыў у саюзніцкіх адносінах, які быў пры Барысе Ельцыне, сышоў у мінулае. І спадзявацца на тое, што пасля фармальнай змены палітычнага лідара ў Расіі будзе ўключаны фарсаж у пабудове Саюзнай дзяржавы, не даводзіцца. Гэта паказалі і апошнія візіты Пуціна ў Беларусь. Пытанне аб гэтай тэме прама не падымалася падчас іх.

Думаю, Расія будзе падыходзіць да тэмы Саюзнай дзяржавы кожны раз, як гэтага будзе патрабаваць знешнепалітычная сітуацыя. І саюзны працэс не будзе замарожаны. Бо гэта — не толькі ў інтарэсах кіраўнікоў краін. Стварэнне паўнацэннай Саюзнай дзяржавы ў інтарэсах насельніцтва. Аднак гэта будзе павольнацечны працэс.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**
**Фота аўтара і БЕЛТА.**

## ДРАГІЧЫНСКІЯ ТРАГЕДЫІ

**Міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў трымае пад асабістым кантролем расследаванне забойстваў пенсіянераў у Драгічынскім раёне.**

Адказваючы на пытанне «Звязды», кіраўнік МУС заявіў, што пакуль яшчэ рана рабіць высновы аб колькасці забітых. Паводле яго слоў, былі выпадкі, калі падазроныя паведамлялі пэўныя звесткі, але яны не пацвярджаліся. «Патрэбны час, каб расследаваць гэтую справу, і я ўстрымаюся ад паспешлівых высноў»,— заявіў Уладзімір Навумаў. Міністр адзначыў, што сам выязджаў у Драгічын, праводзіў там нараду з падначаленымі, і ўвогуле трымае ход расследавання пад асабістым кантролем.

Нагадаю, што факты забойстваў састарэлых людзей былі выяўлены ў Драгічынскім раёне на пачатку гэтага года. Былі затрыманы двое грамадзян Украіны, якія падазраюцца ў тым, што задушылі дзвюх бабулек, каб авалодаць іх грашыма і прадуктамі харчавання. Падчас следства высветлілася, ахвярамі гэтых душагубаў у Драгічынскім раёне сталі яшчэ некалькі пенсіянераў...

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## У ЛЬВОВЕ НА ЛЫЧАКАЎСКІХ МОГІЛКАХ ПРАВОДЗЯЦЬ НАЧНЫЯ ЭКСКУРСІІ

**У Львове ў музеі-запаведніку «Лычакаўскія могілкі» пачалі праводзіць начныя экскурсіі. Як паведамілі БЕЛТА ў дырэкцыі заапарка, такая экскурсія абыдзецца ахвотнікам удвая даражэй за дзённую. Уваходны білет па некропалі будзе каштаваць ад 50 да 80 грыўняў ($10—16) у залежнасці ад колькасці чалавек у групе.**

Для зручнасці наведвальнікаў кіраўніцтва музея-запаведніка ў 2008 годзе плануе закупіць сучасны электрамабіль, які будзе курсіраваць па галоўных алеях могілак. Лычакаўскія могілкі, заснаваныя ў 1786 годзе, — самыя старажытныя могілкі Львова. Некропаль з'яўляецца месцам пахавання многіх гістарычных асобаў: прадстаўнікоў знатных польскіх, аўстрыйскіх і ўкраінскіх родаў, дзеячаў палітыкі і мастацтва. У прыватнасці, тут пахаваны пісьменнік, паэт і філосаф Іван Франко, оперная спявачка Саламія Крушальніцкая... З моманту заснавання на Лычакаўскіх могілках пахавана больш як 400 тыс. чалавек.

# БАЛОТА — НАША БАГАЦЦЕ, выкарыстоўваць яго трэба рацыянальна

**У нашай краіне каля 1,7 мільёна гектараў балот, што складае 6,4 працэнта ад агульнай плошчы тэрыторыі Беларусі.**

Паводле слоў начальніка спецінспекцыі дзяржкантролю Мінпрыроды Наталлі Мінчанка, у нашай краіне было ўтворана 8 Рамсарскіх тэрыторый міжнароднага значэння. Сёння гэта заказнікі «Спораўскі», «Сярэдняя Прыпяць», «Званец», «Альманскія балоты», «Асвейскі», «Ельня», «Котра» і «Прастыр». Рамсарскія тэрыторыі Беларусі займаюць водна-балотныя ўгоддзі на плошчы каля 285 тысяч гектараў. Сёння спецыялісты падрыхтавалі заяўку ў Рамсарскае бюро аб аб'яўленні заказніка «Выгонашчанскае» і Бярэзінскага біясфернага запаведніка водна-балотнымі ўгоддзямі міжнароднага значэння.

Начальнік спецінспекцыі дзяржкантролю за выкарыстаннем і аховай зямель, расліннага свету, лясоў і ландшафтаў Мінпрыроды Уладзімір Саўчанка адзначыў, што ў тарфяную распрацоўку будзе дадаткова прыцягнута каля 32 тысяч гектараў тарфяных балот. Спецыяліст падкрэсліў, што гаворка ідзе аб тарфяніках, плошча якіх складае менш за 2 працэнты ад прыродных балот Беларусі. Плошча парушаных балот сёння ў Беларусі складае 519 тысяч гектараў. Цяпер гэтыя тэрыторыі выкарыстоўваюцца нерацыянальна. У сваю чаргу праект праграмы «Торф» прадугледжвае паўторнае забалочванне і лесааднаўленне.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## МУЖЫК ПЛАКАЎ...

26-гадовы гамяльчанін, дапусціў промах: у банкамаце забыў сваю картку, чым хтосьці скарыстаўся. Калі ж малады чалавек выявіў прапажу, то не мог стрымаць слёз. Добра, што міліцыя, як паведаміў нам кіраўнік прэс-цэнтра УУС Гомельскага аблвыканкама Ігар Грышкевіч, прыняла аператыўныя пошукавыя мерапрыемствы і ўстанавіла асобу зладзея — работніка прадпрыемства «Крышталь», які з пакладзенай у кішэню сумы (1650 тысяч рублёў) частку грошай паспеў зрасходаваць.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ АВТОТРАНСПОРТА НА АУКЦИОНЕ**

ЗАО «Агротехнаука» объявляет открытый аукцион по продаже автотранспорта:

| Номер лота | Наименование | Гос. номер | Год выпуска | Начальная цена с НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Фольксваген Кадди 1,9 л комби | 01-48 АХ-5 | 2001 | 8 600 000 | 860 000 |
| 2 | Фольксваген Кадди 1,9 л комби | 01-49 АХ-5 | 2004 | 13 975 000 | 1 397 500 |
| 3 | Фольксваген Кадди 1,9 л комби | 01-47 АХ-5 | 2001 | 10 750 000 | 1 075 000 |

Задаток на участие перечисляется на р/с 3012205070013 в филиале ОАО «Белагропромбанк»-МГД, г. Минск, ул. Ольшевского, 24, код 963, УНН 100029513, ОКПО 14802677, ЗАО «Агротехнаука».

Договор купли-продажи должен быть заключен не позднее трех дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится 6 марта 2008 года в 10.30 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, административное здание, каб. 304.

Заявления на участие принимаются по 5 марта 2008 г. до 15 00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, административное здание, каб. 304.

**Контактный телефон: +375 17 237 93 93.**

УНН 100029513


# ГАЛОЎНАЕ — НЕ НАШКОДЗІЦЬ

## Пісьмо...

Прачытала артыкул **«Адсутнасць слыху — перашкода?.. ці Яны могуць многае»** (*«Чырвоная змена» за 11.01.08*). Ён мяне зацікавіў. Мая дачка мае слабы слых. Але яна добра размаўляе, носіць слыхавы апарат. Скончыла агульнаадукацыйную сярэднюю школу горада Слоніма. Летам мы з ёй паступалі ў Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Але не паступілі: неахвотна бяруць такіх дзяцей. Хачу даведацца адрас Мінскага каледжа, пра які вы пісалі. Ці можна туды паступаць іншагароднім дзецям? На якіх умовах?

**Галіна Мікалаеўна**, *Гродзенская вобласць.*

## ...і каментарый

Па каментарый да чытацкага ліста я звярнулася да **загадчыцы Цэнтра сацыяльнай і прафесійнай рэабілітацыі для асобаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця**, створанага на базе Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа электронікі, **Святланы РАМАНОВІЧ**:

— У наш каледж могуць паступаць дзеці з усёй краіны. Напрыклад, летась мы прынялі 19 чалавек — усе мінчане. Зараз жа ў нас навучаецца шмат іншагародніх слабачуючых і глухіх студэнтаў. Дарэчы, большасць з іх добра вучацца і прэтэндуюць на другую ступень навучання.

Тэрмін навучання на базе 9 класаў складае 4 гады, на базе 11 класаў — 2 гады. Самыя здольныя навучэнцы могуць дадаткова атрымаць кваліфікацыю — тэхнік-праграміст (для гэтага трэба вучыцца яшчэ 3 гады).

Усе іншагароднія дзеці жывуць у родных, бо ў каледжа няма свайго інтэрната. Таму, калі сям'я не мае блізкіх родзічаў у сталіцы ці з'яўляецца малазабяспечанай (бо пакой у сталіцы каштуе дорага ды і не кожны гаспадар пагадзіцца браць на кватэру чалавека з парушэннямі слыху), то мэтазгодней было б пашукаць месца вучобы, якое знаходзіцца бліжэй да пастаяннага месцажыхарства.

Залічэнне праводзіцца па выніках гутаркі з улікам сярэдняга бала дакумента аб адукацыі і адзнак па прафілюючых прадметах (па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы павінна стаяць не менш як шэсць балаў). Калі ў абітурыента матэматычны склад розуму — гэта наш студэнт.

Такія патрабаванні ўведзены толькі для таго, каб не нашкодзіць маладому чалавеку. Таму і праводзім індывідуальныя гутаркі з кожным патэнцыяльным студэнтам і яго бацькамі. Тлумачым, што, калі ў іх сына ці дачкі няма схільнасцяў да дакладных навук, то ім пасля будзе цяжка давацца вучоба. А гэта пастаяннае эмацыянальнае напружанне, якое дрэнна можа адбіцца на здароўі дзіцяці. Таму трэба абавязкова ўлічваць здольнасці такога чалавека.

Прыём дакументаў ажыццяўляецца пачынаючы з 15 чэрвеня. Але бацькі могуць звяртацца ў наш Цэнтр раней. Яны могуць як патэлефанаваць, так і прыехаць да нас.

Наш адрас: г. Мінск, вуліца Казінца, 91
Тэлефон: 8(017) 212 59 43, 212 11 62

Для паступлення патрэбны наступныя дакументы:

1) Пасведчанне аб базавай адукацыі ці атэстат аб сярэдняй адукацыі;

2) Медыцынская даведка, форма 0-86;

3) Заключэнне МРЭК (пры наяўнасці інваліднасці);

4) Копія пасведчання аб нараджэнні ці пашпарт;

5) Даведка з месца жыхарства;

6) 4 фатаздымкі 3х4;

7) Прыпісное пасведчанне (для хлопцаў).

Акрамя Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа электронікі, у Беларусі маецца яшчэ шэсць устаноў адукацыі, якія арганізуюць навучанне людзей з парушэннем слыху.

1) Віцебскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж лёгкай прамысловасці (г. Віцебск, вул. Гагарына, 39; т. 8(0212) 23 28 93, 23 29 06; рыхтуюць аператараў электронна-вылічальных машын, шаўцоў, пакаёвак).

2) Гомельскае дзяржаўнае ПТВ № 67 будаўнікоў (г. Гомель, вул. Малайчука, 10; т. 8(0232) 56 52 93, 56 42 34; рыхтуюць сталяроў, цесляроў).

3) Гомельскае дзяржаўнае ПТВ № 230 лёгкай прамысловасці (г. Гомель, вул. Лазурная, 26; т. 8(0232) 45 84 24, 45 85 43; рыхтуюць швачак, краўцоў).

4) Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 2 лёгкай прамысловасці (г. Мінск, вул. Маякоўскага, 123; т. 8(017) 221 40 03, 221 36 16; рыхтуюць швачак, краўцоў, вязальшчыц).

5) Барысаўскі дзяржаўны каледж (Мінская вобл., г. Барысаў, вул. 50 гадоў БССР, 4; т. 8(01777) 4 48 77, 4 48 28,; рыхтуюць слесараў механазборачных работ, слесараў-рамонтнікаў).

6) Магілёўскі дзяржаўны эканамічны прафесійна-тэхнічны каледж (г. Магілёў, вул. Чалюскінцаў, 66а; т. 8(0222) 25 22 70, 22 49 00; рыхтуюць швачак, вышывальшчыц, сталяроў, інструктараў).

**За прадастаўленую інфармацыю выказваю падзяку Рэспубліканскаму інстытуту прафесійнай адукацыі.**

**Надзея ДРЫЛА.**


**ТЧУП «ВНЕШАГРООПТ» РЕОРГАНИЗУЕТСЯ ПУТЕМ ПРИСОЕДИНЕНИЯ К НЕМУ ТЧУП «БЕЛКООППРОДУКТ»**

*Претензии принимаются в течение месяца со дня опубликования по тел./ф 8 017 2918233.*



*Віншую з юбілеем праўнучку* ***Вікторыю АВАНЯН****. Жадаю шчасця, удачы, кахання. Хай збудзецца ўсё, што яшчэ не збылося.*

**Бабуля Галя,** *г. Беразіно.*


## ЭСТОНСКАЯ СПАРТСМЕНКА 9 МЕСЯЦАЎ НЕ ПАДАЗРАВАЛА АБ СВАЁЙ ЦЯЖАРНАСЦІ

На працягу 9 месяцаў не падазравала аб сваёй цяжарнасці эстонская яхтсменка Мар'ялійза Умб. Звярнуцца да ўрачоў яе прымусіў вострых боль у жываце. На наступны дзень жанчына выйшла з бальніцы ўжо з дзіцем на руках. Аб гэтым кур'ёзным выпадку расказваюць эстонскія інфармагенцтвы.

Спартсменка, якая толькі што вярнулася з Японіі, на наступную раніцу павінна была ехаць на трэніроўкі ў Іспанію. Медыкі дыягнаставалі цяжарнасць, аднак разышліся ў думках наконт яе тэрміну: разбежка складала ад 4 да 35 тыдняў. Персанал бальніцы перажыў сапраўдны шок, калі назаўтра жанчына нарадзіла даношанае дзіця вагой 3,9 кг і ростам 51 см.

Мар'ялійза Умб сцвярджае, што не адчувала ніякіх адзнак цяжарнасці. Яна важыла 64 кг. Тое, што цяжарнасць была непрыкметнай, урачы тлумачаць натрэніраванасцю мышцаў, спартсменкі.

**Кар. БЕЛТА.**

# ШУКАЕЦЕ КАХАННЕ? А Ў ІНТЭРНЭЦЕ ГЛЯДЗЕЛІ?

**Як жа пашанцавала Адаму з Евай — былі яны на цэлым свеце адны, і таму ніякіх праблемаў з выбарам каханай(ага) у іх не ўзнікала. А зараз на планеце Зямля больш за шэсць з паловай мільярдаў людзей жыве, вось і паспрабуй тут знайсці сваю так званую «другую палавінку»! І калі знаёмства Адама з Евай было на 100 працэнтаў запланаваным і непазбежным, то сёння людзі чаго толькі не прыдумваюць, каб пазнаёміцца і, не дай Божа, прапусціць гэтую сваю «палавінку». І чым далей крочыць цывілізацыя, тым больш шырокімі становяцца магчымасці для знаёмстваў. Так, напрыклад, да даволі традыцыйных спосабаў шукаць новых знаёмых на працы, на вучобе, на спартыўных пляцоўках, у грамадскім транспарце ды проста на вуліцы не так даўно далучыўся і спосаб віртуальны, гэта значыць — праз Інтэрнэт. Вось на ім мы і спынімся, абмацаем з усіх бакоў ды паспрабуем разгледзець усе зручнасці і недахопы.**

## Пішыце пісьмы на... анкету!

Інтэрнэт дае вялікае мноства магчымасцяў пазнаёміцца праз розныя сэрвісы: чаты, ICQ, форумы ды розныя анлайн-дзённікі. Але найбольш простым і папулярным спосабам з'яўляецца рэгістрацыя на спецыялізаваных сайтах знаёмстваў. Усё проста. Прыходзіш увечары дадому. Надзяваеш утульныя тапкі. Вячэраеш. Заварваеш кубачак духмянай гарбаты. Потым сядаеш перад маніторам. Заходзіш на адзін з сайтаў знаёмстваў. Рэгіструешся. Запаўняеш пункты анкеты «Пра сябе» і «Каго шукаю». Закачваеш некалькі сваіх фатакартак. І... чакаеш. А, напрыклад, за гэты час чакання можна схадзіць памыць кубак з-пад гарбаты. Ці пакарміць любімага ката Мурзіка... А потым вяртаешся ў Інтэрнэт праз колькі гадзін — і во, табе напісалі некалькі чалавек. Глядзіш іх анкеты і ўступаеш у перапіску. Або проста ігнаруеш іх, калі людзі табе не спадабаліся.

Паколькі ахвотнікаў размясціць свае даныя хапае, то з цягам часу твая анкета ўсё глыбей і глыбей хаваецца ў «багне» базы карыстальнікаў сайта. І таму адным чаканнем новых знаёмых ужо не знойдзеш. Трэба пераходзіць для актыўных дзеянняў — да пошуку. Загружаеш адпаведную старонку, уводзіш крытэрыі пошуку (напрыклад, «я — хлопец, шукаю дзяўчыну 20—25 гадоў»), знаходзіш анкеты і асабліва сімпатычным асобам пішаш розныя фразы, кшталту: «Добры дзень. Я — Вася. Давайце знаёміцца».

Згадзіцеся, што гэта сапраўды проста! Сядзі толькі ды паспявай пісаць адказы новым знаёмым. Аднак ёсць людзі, упэўненыя амаль на 100 працэнтаў, што ў Інтэрнэце знаёмяцца людзі непаўнацэнныя, якія ў рэальным жыцці не здольныя на такі «подзвіг». Я думаю, гэта людзі, якія проста... не спрабавалі знаёміцца праз Сеціва!..

## Людзі кажуць, што...

Але звернемся лепей да тых, хто мае сякі-такі вопыт віртуальных стасункаў. Ну вось што, напрыклад, кажа Вольга, трэцякурсніца БДУ:

— Глабальнае сеціва — гэта такое ж месца пазнаёміцца, як і дыскатэка, клуб, вуліца або грамадскі транспарт. Інтэрнэт я выкарыстоўваю для знаёмстваў не «замест», а «разам».

— Каля трох гадоў вісіць мая анкета ў сусветным павуцінні, — дзеліцца віртуальным вопытам Кацярына, студэнтка філалагічнага факультэта. — За гэты час, зразумелая справа, паспела прагледзець кіпу чужых анкет, пагутарыла са шматлікімі людзьмі з Інтэрнэту ў «рэале». Падабаецца, што спачатку пра чалавека можна нешта даведацца з яго анкеты. Толькі занадта верыць гэтаму не варта — шмат хто любіць прыхарашыць сябе любімага, а таксама скінуць сабе энную колькасць кілаграмаў ды стаць крыху вышэйшым. Я лічу, што знаёміцца праз Інтэрнэт зручна занятым людзям. Вось, напрыклад, я вельмі адказна стаўлюся да вучобы, і таму ў мяне практычна няма часу хадзіць па дыскатэках ды начных клубах. А чвэрць гадзіны ў суткі на прагляд новых паведамленняў заўсёды адшукаецца. Толькі крыўдна бывае, калі пазнаёмішся з кім-небудзь у сеціве, намалюеш у сваім уяўленні вобраз віртуальнага суразмоўцы гэтакім паўбогам, а потым на спатканні толькі разумееш, што ў чалавеку нічога асаблівага і няма...

Выказаў сваё меркаванне пра Інтэрнэт і начальнік псіхалагічнай службы БДУ Руслан Папок:

— З аднаго боку, нічога дрэннага ў тым, што людзі знаёмяцца і маюць стасункі праз Інтэрнэт, няма. Наадварот, віртуальныя адносіны маюць шмат плюсоў: на гэта губляецца менш часу, некаторыя тэмы можна абмеркаваць больш свабодна, месцазнаходжанне суразмоўцы не так важна, кола суразмоўцаў можна зрабіць даволі вялікім... Але з-за гэтых плюсоў у чалавека можа ўзнікнуць залежнасць. Ён перастае рухацца і спрабаваць знайсці знаёмых у рэальным жыцці, а пераход ад віртуальных стасункаў да рэальных становіцца ўсё больш і больш цяжкім... Напрыклад, у чаце, форуме гэты чалавек адчувае сябе ўтульна, класна, як рыба ў вадзе. Але вяртаецца ў рэальны свет, бачыць прыгожую дзяўчыну — а пазнаёміцца ўжо не можа, бо навыкі адносінаў у рэальнасці згублены. Я лічу, што павінна быць культура карыстання Інтэрнэтам, і ў прыватнасці — зносінаў паміж людзьмі праз камп'ютар. Бо, насамрэч, віртуальныя зносіны не вырашаюць усіх праблем. Думаеце, чаму прыдумалі смайлы? Гэта спроба перадаць эмоцыі. Аднак сапраўдных, жыццёвых эмоцый смайламі не перадасі, таму камп'ютар ніколі не заменіць рэальных стасункаў. І адносіцца да Інтэрнэту трэба як да інструмента, а не да чагосьці жывога. Пазнаёміліся ў сеціве, пагутарылі крыху, і лепей паспрабаваць перанесці стасункі ў рэальнае жыццё...

## Тры гісторыі пра Інтэрнэт і жыццё

**Гісторыя № 1, сумная.** Жыла-была дзяўчына. І стала ёй аднойчы сумна. Бо з хлопцам нядаўна пасварылася, дый наогул на душы моташна было ад розных жыццёвых праблем. Вось і палезла яна ў Інтэрнэт у пошуках шчасця. І патрапіла на анкету аднаго хлопца. Фоткі — проста класныя, дый як чалавек ён таксама падаўся даволі цікавым. І пачала дзяўчына перапісвацца з гэтым хлопцам. Чым болей перапісвалася, тым болей захаплялася яго асобай, бо чалавекам ён аказаўся сапраўды вельмі цікавым і добрым. І дайшло да таго, што яна ўжо цэлымі днямі толькі пра свайго «куміра» і думала. Так прайшло недзе каля двух месяцаў. І вырашыла наша дзяўчына нарэшце сустрэцца з тым хлопцам. Напісала пра сваё жаданне і атрымала адказ, якога ну ніяк не чакала. Аказалася, што перапісвалася яна ўвесь гэты час не з хлопцам, а з дзяўчынай, якая вяла анкету ад мужчынскага імя з «левымі» фатакарткамі!.. Ну вы разумееце, у якім шоку была бедная дзяўчынка і чаго ёй каштавала ўзніклую сітуацыю пераасэнсаваць.

**Гісторыя № 2, вясёлая**. Была знойдзена на адным з сайтаў знаёмстваў. Дваццацігадовая дзяўчына піша: «Спісаліся ў I-net'е з класным хлопцам. Вырашылі сустрэцца, правесці бурна разам пару гадзін. Сустрэліся. Гэта аказаўся мой муж».

**Гісторыя № 3, амаль што неверагодная.** «Сядзеў» адзін хлопец на знаёмствах. Гутарыў з рознымі сімпатычнымі спадарынямі. Так вось і з адной — абмяняўся некалькімі фразамі накшталт «Як справы? Нармальна!» дый забыўся. А праз колькі дзён ехаў у метро і ўбачыў сімпатычную дзяўчыну. Ну і вырашыў падысці пазнаёміцца. І падышоў, і пазнаёміўся. Але паколькі спяшаўся, то запісаў хуценька яе тэлефон ды збег па справах. А ўвечары вярнуўся дадому, уключыў камп'ютар, загрузіў сайт знаёмстваў і знайшоў паведамленне ад дзяўчыны (той, з якой колісь гутарыў на тэму «Як справы? Нармальна!»): «Сёння мы пазнаёміліся ў метро :) Мяркуеш, гэта супадзенне?..» І сапраўды: на сайце амаль 12 тысяч анкет дзяўчат з гэтага горада, у горадзе жыве 1,7 мільёна чалавек, у сутках налічваецца 1440 хвілін — і ўсе гэтыя паказчыкі ў адзін цудоўны момант поўнасцю супалі! Ну хіба не дзівосы лёсу?..




## Дык што рабіць? Плюсы і мінусы віртуальных знаёмстваў

Спачатку давайце акрэслім станоўчыя бакі Інтэрнэт-знаёмстваў:

- перад гутаркай можна пачытаць даныя з анкеты і хоць бы прыкладна атрымаць уяўленне пра асобу суразмоўцы;
- віртуальнае знаёмства не займае шмат часу, бо праверыць новыя паведамленні можна і за пятнаццаць хвілін падчас перапынку на абед з працоўнага камп'ютара, вядома ж, пакуль шэф не бачыць;
- у сеціве можна «паплакацца ў камізэльку» незнаёмаму чалавеку, які можа жыць ад вас за тысячы кіламетраў;
- ананімнасць дазваляе асмеліцца на знаёмства нават крыху закамплексаваным людзям, бо адна справа — напісаць «прывітанне», а зусім іншая — сказаць у твар.

Ну а зараз і пра мінусы, бо куды ж без іх:

- «анлайнавыя» і рэальныя» асобы не так часта супадаюць у чалавеку, таму, каб пазбегнуць расчараванняў, лепей не ствярайце загадзя вобраз «прынца на белым кані» і сустракайцеся ў рэальнасці як мага хутчэй — мо, гэта і праўда ваш прынц, хай сабе і без каня?
- напісаць пра сябе «90-60-90» карыстальніку можа перашкодзіць толькі ўласнае сумленне...
- Інтэрнэт — рэч пакуль што платная, таму пазнаёміцца на вуліцы ці ў краме можна «нахаляву», а вось у сеціве — толькі за грошы, вядома ж, калі камп'ютар не службовы.

Ну вось, зараз вы ўжо ведаеце большасць падводных камянёў Інтэрнэт-знаёмстваў. Але вырашыць, ці патрэбна дапамога сусветнага павуціння, кожны для сябе павінен сам. Калі хапае адносінаў з іншымі людзьмі ў рэальным жыцці, то сапраўды, навошта тое сеціва? Толькі пальцы аб клавіятуру сціраць. Але калі ўзнікае жаданне пашырыць кола знаёмых з дапамогай Інтэрнэту, то калі ласка — ён адкрыты для ўсіх. І ганебнага тут нічога няма. Добрых людзей хапае і ў «віртуальнасці», а розных вычварэнцаў — і ў жыцці. Галоўнае, памятайце, што ніякі смайл не заменіць шчырай усмешкі, а сукупнасць жалеза і пластыка пад чароўнай назвай «камп'ютар» — жывога чалавека, на якога можна не толькі глядзець, але і, напрыклад, запрасіць у кіно.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Прамая лінія

# НАША СКУРА — ЛЮСТЭРКА ІМУНІТЭТУ

**Адказвае ўрач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурна-венералагічнага дыспансэра Уладзімір ЯРОМІЧ**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***(Працяг. Пачатак у нумары за 30 студзеня.)***

***☎ — Дзень добры! Турбуе Галіна Аляксандраўна з Клецкага раёна. Перахварэла на герпес, ахоплена ўся левая частка цела — лапатка, пазваночнік, грудная клетка. Плямы часам моцна свярбяць. Карыстаюся мазямі накшталт капсікаму. П'ю дыклафенак і спазмалгон. Што яшчэ можна выкарыстоўваць, каб пазбавіцца свербу?***

— Мазі тут могуць быць не заўсёды эфектыўнымі. Іх у дадзеным выпадку ўжо недастаткова. Звярніцеся, калі ласка, да неўрапатолага па месцы жыхарства, таму што зараз у вас маюць быць астаткавыя з'явы пасля перанесенага герпесу. Герпес жа паражае нервовыя канчаткі, таму вам абавязкова патрэбна кансультацыя спецыяліста і прызначэнне адэкватнага лячэння.

***☎ — Ніна Пятроўна са Стаўбцоўскага раёна. У мужа — такая праблема: кожная драпіна вельмі дрэнна зажывае. А калі і зажыве, то застаецца якая-небудзь пляма. Хутка рукі цалкам пакрыюцца чырвонымі плямамі. Не ведаем, як змагацца з гэтым...***

— А як спрабавалі змагацца?

***— Ён хадзіў да тутэйшых урачоў, выпісвалі яму нейкія таблеткі, вітаміны, але нічога не дапамагло.***

— А было штосьці падобнае раней?

***— Не было. З'явілася па вяртанні з арміі.***

— Магчыма, ваш муж атрымаў там алергію на нейкае рэчыва. Патрабуецца абследавацца па месцы жыхарства. Калі там не змогуць устанавіць дакладную прычыну такой рэакцыі, папрасіце накіраванне ў Рэспубліканскі кансультацыйны цэнтр, які знаходзіцца на базе нашага мінскага дыспансэра.

***☎ — Лепельскі раён, звоніць Наталля Аляксандраўна. Дзіцяці — 4 месяцы. Дыягназ — атапічны дэрматыт. Не ведаем, чым яго лячыць. Звярталіся да алерголага Віцебскай абласной бальніцы. Нам прызначалі мазь адвантан і ін'екцыі супрасціну...***

— А да дэрматолага звярталіся?

***— Нас не накіроўвалі.***

— У Віцебску працуюць яшчэ і цудоўныя дэрматолагі. Трэба, каб яны паглядзелі дзіця. Мяркую, там падбяруць харчаванне і прызначаць нейкае вонкавае сістэмнае лячэнне.

***☎ — Мінск, Тамара. Сем гадоў таму з'явілася раздражненне на руках, якое высыпала толькі ў летні час. У апошні ж год праблема не знікае на працягу ўсяго года. Урач прапісаў ларатадзін, аевіт, рутаскарбін, мазі — гідракартызон, метылурацылавую. Але нічога не дапамагае. Скура — шурпатая, з'яўляюцца пухіркі, лопаюцца, свярбяць. Што мне рабіць?***

— Мяркуючы па расказаным, можна зрабіць заключэнне, што гаворка ідзе пра экзэму. У такім выпадку вышэйпамянёныя мазі будуць не актуальныя. Верагодна, трэба замяніць і таблеткі. Але трэба агледзець вас, дакладна падабраць належнае лячэнне. Як вядома, лечыцца не захворванне, а чалавек. Трэба пашукаць прычыну хваробы. Варта мець на ўвазе, што экзэма абвастраецца пасля кантакту з вадой, бытавой хіміяй, а таксама пасля нервовых перажыванняў. Таму тут лячэнне павінна быць строга індывідуальным. Па магчымасці варта звярнуцца да спецыяліста як мага хутчэй, паколькі тое, што доўжыцца на працягу некалькіх месяцаў, лічыцца хранічнай праблемай і лечыцца значна складаней. Звярніцеся, калі ласка, да дэрматолага па месцы жыхарства.

***☎ — Надзея Міхайлаўна, Мінск. Скажыце, што вы параіце маладой дзяўчыне, якая пакутуе ад прышчоў, што з'яўляюцца напярэдадні менструацыі?***

— Найперш варта звярнуцца па кансультацыю да гінеколага-эндакрынолага. Калі ўрач высветліць, што ніякай паталогіі ў гэтым сэнсе няма, то тады варта звяртацца да дэрматолага. Нельга параіць што-небудзь дакладнае, калі не бачыш канкрэтнага пацыента. Акнэ можа быць прычынай самых розных расстройстваў, агульнай парады тут не існуе.

***☎ — Мінск на провадзе, Святлана Мікалаеўна. У асенне-зімовы перыяд другі год запар пакутую ад моцнага свербу на скуры галёнкі. Скура нагадвае алергічную. Калі пачынаеш чесаць, становіцца шурпатай, але высыпак няма.***

— Калі вы назіраеце нейкую сезоннасць у вашай праблеме, то ў наступны раз яшчэ да таго, як з'явяцца падобныя адчуванні, варта папрымаць антыгістамінны прэпарат кетаціфен, да якога не развіваецца прывыканне. Па адной таблетцы 1—2 разы на дзень.

***— А цяпер ужо нічога нельга зрабіць?***

— Цяпер можна звярнуцца да дэрматолага, які агледзіць вас і прызначыць адпаведнае лячэнне.

***☎ — Людміла Іванаўна з Вілейкі непакоіць. Мне 58 гадоў. Дзесьці з пайгода неверагодна свярбіць цела, асабліва калі надыходзіць час сну. Дэрматолаг рэкамендаваў абследаваць страўнікава-кішачны тракт, зрабіць ультрагукавое даследаванне брушной поласці, здаць аналіз крыві. Выявілі толькі стары гастрыт. Тэрапеўт рэкамендавала той жа супрасцін і іншыя супрацьалергічныя прэпараты. Але, на маю думку, гэта слабая дапамога...***

— А высыпанні на скуры ёсць?

***— Ёсць. Кропачкі чырвоныя.***

— У вашым выпадку, мяркую, перш-наперш трэба выдаліць магчымасць каросты, а для гэтага неабходна яшчэ раз пайсці да дэрматолага.

***— Я разумею, але мне кажуць, што гэта не кароста.***

— І ўсё ж такі я вам раю яшчэ раз падысці да спецыяліста. Апісаныя вамі сімптомы найбольш падобныя на гэта захворванне.

***— А што, акрамя агляду, мне прапануюць?***

— Часам мае сэнс правесці пробнае лячэнне, для якога існуюць спецыяльныя прэпараты. Але важна агледзець вас, паколькі калі ваша праблема носіць алергічны характар, то пасля выкарыстання пробнага лячэння можа надысці пагаршэнне стану.

***— Вы не скажаце, куды лепей звярнуцца?***

— Мясцовыя ўрачы могуць накіраваць вас на вобласць.

**Святлана БАРЫСЕНКА,**
**Вольга ШАЎКО.**
***(Працяг будзе.)***



Вёска Малая Люцынка Валожынскага раёна. Месца былой сядзібы ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**На фестывалі «Заслаўе-2008» прагучыць музыка беларускіх кампазітараў, якія жылі ў адзін час з Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам. 31 студзеня і 1 лютага традыцыйнае ўжо свята высокага мастацтва пройдзе ў восьмы раз. Камерныя калектывы і ансамблі падрыхтавалі сваім слухачам разнастайнае музычнае меню.**

# СТАРАЖЫТНАБЕЛАРУСКАЯ МУЗЫКА ЗАЙГРАЕ Ў ЗАСЛАЎІ

Калі параўноўваць са «Славянскім базарам» ці святам песні і паэзіі ў Маладзечне, фестываль у Заслаўі, вядома ж, саступае па колькасці ўдзельнікаў, наведвальнікаў і размаху. Аднак у мастацтве не гэта галоўнае. Затое тут можна пачуць высокі клас выканання твораў, ды і калектывы ў асноўным прыязджаюць прафесійныя. Таму фестываль гэты складаецца не з сустрэчы аматараў, а з выступленняў даўно вядомых, правамерна заслужаных музыкантаў і кампазітараў. Дарэчы, падобных музычных сустрэч не так ужо і шмат. Таму фестываль «Заслаўе-2008» прыцягвае нязменную ўвагу. Сёлета вялікая частка яго праграмы будзе прысвечана 200-годдзю з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

— Будуць выкананы творы нашых землякоў, якія былі сучаснікамі славутага творцы — музыка Напалеона Орды, Міхаіла Ельскага, Станіслава Манюшкі. Таксама прагучаць музыка да п'есы Дуніна-Марцінкевіча «Ідылія», якую стварыў наш сучаснік кампазітар Уладзімірам Кур'ян, — паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Святлана Баранок. — Творы наблізяць слухачоў да той эпохі, дапамогуць зразумець атмасферу XIX стагоддзя.

Цікава яшчэ, што ў праграме фестывалю будуць і выступленні калектыву настаўнікаў і выхаванцаў Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў. Менавіта з яе пачнецца музычная праграма — у сценах установы пройдзе творчая сустрэча з Дзмітрыем Смольскім, а потым майстра-клас для навучэнцаў правядзе прафесар Ігар Алоўнікаў. А палове сёмай 31 студзеня адбудзецца ўрачыстае адкрыццё музычнага свята. Праграма называецца «Слова, натоленае музыкай». Аматараў мастацтва чакаюць выступленні камерных калектываў Нацыянальнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусі. Адметна, што і канцэрт будзе весці прафесіянал — музыколаг, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Вольга Дадзіёмава. VIII свята музыкі «Заслаўе-2008» будуць вітаць паэты Віктар Шніп, Навум Гальпяровіч, Алесь Бадак.

На другі дзень, пасля выступленняў калектыву школы мастацтваў, вечарам адбудзецца аўтарскі канцэрт Дзмітрыя Смольскага, прысвечаны 75-годдзю Беларускага саюза кампазітараў, а потым слухачоў зноў парадуюць камерныя калектывы Нацыянальнага канцэртнага аркестра — ансамбль флейтыстаў, ансамбль салістаў на драўляных духавых інструментах пад кіраўніцтвам вядомых не толькі ў нашай краіне Барыса Нычкова і Генрыха Гедыльтэра, выступяць ансамбль трубачоў «Інтрада», кларнетысты, струнны квартэт Нацыянальнага канцэртнага аркестра, камерны аркестр Валерыя Сарокі.

— Наша мэта — прыцягнуць як мага больш людзей да азнаямлення з духоўнай спадчынай, прапаганда беларускай культуры, якая яшчэ недастаткова вывучана, — паведаміла Святлана Баранок. Трапіць на канцэрт можна будзе па запрашальных і платных білетах. Мастацкі кіраўнік свята — народны артыст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесар Міхаіл Фінберг.

Увогуле, юбілей Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча святкуюць зараз ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці. Абласная бібліятэка імя Пушкіна прапануе фотавыставу «Асветнік з Люцынкі», а Рэспубліканскае свята, прысвечанае памяці славутага земляка, адбудзецца 6 лютага на яго радзіме ў Валожынскім раёне.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**

# ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА.

## «Пагода ў доме»-4

Працягваем чацвёрты класіфікацыйны конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік — Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках.

Сёння падаём **шостае заданне** (аўтар — Уладзімір БАНДАРЫК, в. Лугавая Слабада Мінскага раёна):



БЕЛЫЯ: a3, b6, c1, e3, f4, g3 (6). ЧОРНЫЯ: a5, d2, d8, e7, g7, h2, h6 (7). Выйгрыш.

Удзельнікі нашых папярэдніх конкурсаў могуць пачаць з пятага задання. Таму паўтараем яго (аўтар — Віктар Шульга, Мінск):

БЕЛЫЯ: a5, e7, f4, g5, дамкі a7, c5, e1, h2 (8). ЧОРНЫЯ: b8, дамка a1 (2). Заперці простую чорных.

Па-за конкурсам раім разгледзець яшчэ некалькі твораў на 64-клетачнай дошцы У. Бандарыка:

№ 1. БЕЛЫЯ: c3, e1, f4, g3, g5, h6 (6). ЧОРНЫЯ: b6, d4, d6, e5, f8, h2 (6).

№ 2. БЕЛЫЯ: a5, b6, e1, f2, g3, h2 (6). ЧОРНЫЯ: a7, b4, c3, d4, e5, f6, f8, g5 (8).

№ 3. БЕЛЫЯ: a5, c7, e5, f2, f4, g3 (6). ЧОРНЫЯ: a7, b2, b4, c3, d8, g7, h2 (7).

Ва ўсіх камбінацыях — ход і перамога белых.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

## Госць з Украіны

А на 100-клетачнай дошцы пазнаёмцеся з новай задачай нашага пастаяннага аўтара з Украіны Уладзіміра РЫЧКІ:



БЕЛЫЯ: 16, 17, 34, дамкі 6, 9, 14, 19, 39 (8). ЧОРНЫЯ: 1, дамка 15 (2). Замкнуць простую чорных: 29 (50 A) 37, 33 (6 B) 33-11, 11, 14-32, 16, 21, 9-31#. B (7) 16-11, 9-31, 26, 21, 47, 26, 31, 14-41#.

Варыянт жа A (11) знайдзіце самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

## Вынікі конкурсу

Лаўрэатамі класіфікацыйнага конкурсу на прызы нашага шчодрага чытача Івана Астроўскага (Мінск) сталі пенсіянер, былы намеснік начальніка КРУ аблспажыўсаюза Уладзімір Аўласенка (Гродна), эканаміст ЗСАТ «Бролі» Сяргей Гурыновіч (Мінск), токар-універсал завода «Тэхнапрылада» Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў), механік АТУП-9 Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў) і аператар тэхналагічнай установкі ААТ «Нафтан» Пётр Шклудаў (Наваполацк). Яны набралі па 12,5 ачка і атрымаюць кнігу Б. Берлінкова і А. Ракітніцкага «Шашечные партии белорусских мастеров» (Минск, «Полымя», 1983).

Столькі ж ачкоў і ў актыве Івана Працука (Паставы), Канстанціна Козела (в. Ласосна Гродзенскага раёна) і Аляксандры Камінскай (Вілейка), але яны выслалі рашэнні некалькі пазней, чым іх вышэй пералічаныя канкурэнты.

Далей у конкурснай табліцы размясціліся: Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), Анатоль Пярхальскі (Глыбокае), Васіль Краўчук і Сяргей Нячаеў (Баранавічы), Уладзімір Бандарык, М. Барысенка, А. і Юлія Мікулічы і В. Савіцкі (Мінскі раён), Аляксандр Кіслы (Узда), Іосіф Мацкевіч (Жодзіна), Аляксандр і Ігар Ашыхміны і Уладзімір Ціханаў (п/а Рудаўка Нясвіжскага раёна), Іосіф Буяк (в. Баціяны Воранаўскага раёна), Аляксандр Янчук і яго вучні Дзмітрый Семянюк, Таццяна Трацюк і Дзіяна Шаўчук (Камянец), Аляксандр Агіевіч (Кобрын), Віктар Жукоўскі (г.Барань Аршанскага раёна), Аляксандр Перавознікаў (Рагачоў), Аляксандр Белы, В. і Р. Мурашкі і Міхаіл Падбярэзскі (Наваполацк) — па 12, Васіль Грабенка (Мінск) — 6,5, В. Гаўрыш (в. Навасёлкі-1 Пастаўскага раёна) і Уладзімір Семашка (Брэст) — па 6 ачкоў.

Пераможцы конкурсу пацвердзілі сваё высокае званне першакласных рашальнікаў. Норма ж другога разраду склала 12 ачкоў. Дадзеная публікацыя з'яўляецца падставай для прысваення звяздоўскім канкурсантам адпаведных разрадаў.

Конкурс быў прысвечаны 90-годдзю газеты «Звязда». Мы вельмі ўдзячныя чытачам за актыўны у ім удзел, а навукоўцу І. Астроўскаму — за прызы.

**У суд Фрунзенскага раёна г. Мінска** паступіла заява аб прызнанні памерлым **МІХАЙЛЕВІЧА Генадзія Якаўлевіча**, 29 жніўня 1949 года нараджэння, ураджэнца г. Мінска, які раней пражываў у г. Мінску па вул. Якубоўскага, 15-1-128. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Міхайлевіча Г.Я., паведаміць іх суду Фрунзенскага раёна г. Мінска на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

## Дзённік Вікі Ц.



***Расселіся тут. Прыйшлі, паселі. Бруду нанеслі. Хто іх клікаў? І спакою няма, цэлы дзень ходзяць і ходзяць. Толькі памыеш падлогу, а яны зноў. А каб на цябе халера! Куды цераз анучу пайшоў?!***

***...Кожны хоць раз у жыцці чуў (а нехта і гаварыў) гэту пранікнёную прамову — тое, што ў п'есах звычайна пазначаюць «буркоча сабе пад нос». Асабіста мне гэты ўспамін навеяны нядаўнім фіналам «ЕўраФэсту».***

***31.01.2008***

# Вялікія постаці «маленькіх людзей»

Хто як глядзеў той фінальны канцэрт — адны дома ля тэлевізараў, другія на вуліцы ля вялікіх плазмавых экранах, трэція непасрэдна ў Палацы спорту. Чацвёртыя не глядзелі ўвогуле, і гэта іх права, але размова не пра тое. У нас, журналістаў, работа такая — хочаш не хочаш, будзь ласкавы, прыйдзі на месца падзеі і глядзі жыўцом. Вось мы і глядзелі — то з-за сцэны, то з танцпляцоўкі. А паколькі конкурс усё ж тэлевізійны, раз-пораз ацэньвалі «карцінку» на экране, непадалёк ад службовага ўваходу.

Аднак тэлепрагляд выйшаў кароткім. Бо вахцёрка, якая сядзела ў шкляным будане на ўваходзе, вырашыла, што менавіта ад тэлевізара ў яе баліць галава, і з задавальненнем шчоўкнула пультам. Мы паспрабавалі патлумачыць, што гэта важна — нуль рэакцыі. Давялося ўмяшацца тэлевізійнікам — не апошняга рангу кіраўнікам, між іншым. Толькі пасля некалькіх тэлефонных званкоў і тлумачэння «гэта ўвогуле цалкам наша мерапрыемства, і памяшканне мы арандавалі на пэўны час таксама цалкам» удалося знайсці кампраміс. І то адносны — пульта з рук вахцёрка так і не выпусціла, зрабіўшы гук ледзь-ледзь чутным. «Адпомсціла».

Крыху пазней парадавала яшчэ гардэробшчыца — прыйшла пад расчыненыя дзверы і закрычала, што калі зараз жа ўсе не забяруць свае курткі і паліто, то яна ўсё зачыняе і ідзе дадому, а астатнія як сабе хочуць, хоць голыя.

Так, натуральна, я разумею, што практычна поўнач, і ўсе стаміліся, і гледачы амаль усе разышліся, і прэмію за звышурочную працу невядома калі дадуць, а можа, заплацяць маленькую. Але мы тут, заўважу, таксама на працы. У нас прэс-канферэнцыя ідзе з беларускімі і замежнымі «зоркамі» — нічога, мы вам не перашкаджаем?..

На кантрасце ўспамінаюцца «Lordi» — фінскія рок-монстры, якія паводзілі сябе абсалютна карэктна і прыязна. «Момант, пліз!» — просяць фатографы, і суровыя фінскія мужчыны паслухмяна спыняюцца на пару хвілін. Дый потым ад прыхільнікаў не адмахваюцца. І калі сярод натоўпу дзяцей ля грымёркі былі ўнук ці ўнучка той вахцёркі, а мо, гардэробшчыцы (а адкуль яшчэ за кулісамі ноччу столькі дзяцей?) — я чамусьці ўпэўненая, «Lordi» не адмовіліся сфатаграфавацца з імі.

Падобныя гісторыі можна расказваць бясконца. Пра тое, як «вартаўнік» ва ўстанове з прапускной сістэмай адмаўляецца прапусціць без спецдазволу чалавека, які прыйшоў на хвілінку па справах, але чароўным чынам дазваляе «праслізнуць» загадкавым распаўсюджвальнікам з торбамі кітайскіх падробак. Пра тое, як прыбіральшчыца ў паліклініцы, нягледзячы на твой бледны твар і відавочную тэмпературу, грозна камандуе — туды ідзі! там сядай! няма чаго ўвогуле бадзяцца, калі хворая! Пра ахоўнікаў у некаторых начных клубах, якія часта маюць «царкоўна-прыхадскую» адукацыю, але ўпэўнена здзяйсняюць фэйс-кантроль — элементарна, паводле прынцыпа «нешта мне ягоны твар не падабаецца».

Дарэчы, пра ахоўнікаў. З імі ў мяне звязаны асобны культурны шок. У падлеткавым узросце, толькі бачком дакранаючыся да культурнай тэматыкі, я шчыра лічыла, што «самыя-самыя» музычна падкаваныя людзі — гэта ахоўнікі ў канцэртных залах, якія пастаянна і бясплатна слухаюць выдатныя выступленні розных «зорак». Але аднойчы ўбачыла, як на канцэрце «Чыж і Ко» ахоўнікі гвалтам прымушаюць гледачоў сядзець, не ўздымаючыся з месцаў. Абурылася: «Ну што вы, гэта ж Чыж!». Адказ быў шэдэўрам: «Чыж, стрыж — мне ўсё роўна, абы сядзелі!».

Хтосьці справядліва заўважыць — часы змяніліся, і людзі таксама. Безумоўна. Аднак далёка не ўсе — у лепшы бок. І не адну мяне здзіўляе, калі прадаўшчыца страчвае маўленне ад простага «дзякуй». Або не страчвае, абслугоўвае цябе ветліва — а следам раве на бабульку-дзьмухавец, якая не зможа накрычаць у адказ і абараніць сябе. Калі чалавек не будзе НАРМАЛЬНА выконваць сваю работу, пакуль у яго не папросіш кнігу заўваг і прапаноў, або, у асобных выпадках, не раскрыеш службовае пасведчанне. Калі «дробныя сошкі» ў імкненні пацвердзіць сваю годнасць і значнасць пачынаюць самасцвярджацца, пераходзячы ўсе межы разумнага. Праўду казалі ў адной старой песні: няма ў жыцці маленькіх роляў, а вось дробных артыстаў — колькі хочаце...

Яшчэ аднаго персанажа не магу не прыгадаць для паўнаты карціны. Звычайны вадзіцель звычайнага гарадскога аўтобуса. Проста сумленна робіць сваю працу. Але — як! Калі б ведала нумар, толькі з ім і каталася б. «Не гумовы аўтобус, грамадзяне, — ласкава даносіцца з дынамікаў на чыстай беларускай, і пастаянныя пасажыры пачынаюць усміхацца. — Калі нехта асабліва спяшаецца і нервуецца, можаце падштурхнуць машыну, раптам хутчэй паедзе. Дзякуй за ўвагу». Так пад агульныя смяшкі і ездзіць. Не псуючы настрой ні сабе, ні людзям.

Гэтага, уласна кажучы, усім і хацела пажадаць. І яшчэ — памятайце пра закон бумеранга: зробленае ці сказанае рана ці позна вяртаецца. Вялікіх вам здзяйсненняў на кожным, няхай сабе нават маленькім, фронце.

## АБЛЕГЧАНЫ РЭЖЫМ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ, РАСІЯН І ЎКРАІНЦАЎ, ЯКІЯ ПРЫЯЗДЖАЮЦЬ НА РАБОТУ

**Польшча ўводзіць аблегчаны рэжым для тых, хто прыязджае на работу з Беларусі, Расіі і Украіны, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на прадстаўніка польскага міністэрства працы і сацыяльнай палітыкі.**

З 1 лютага гэтага года беларусы, расіяне і ўкраінцы атрымліваюць магчымасць працаваць у Польшчы без перапынку 6 месяцаў.

Раней яны павінны былі праз кожныя 3 месяцы работы выязджаць дадому, маючы магчымасць вярнуцца ў Польшчу не раней, чым пасля заканчэння трох месяцаў.

**БЕЛТА.**

**Хочаце — верце, хочаце — не**

# Прыцэльныя стрэлы Перуна?

Нядаўні аповед пляменніка Юры пра незвычайны пярун, які ўшчэнт знішчыў агромністую старую ліпу і пашкодзіў будынак колішніх сельсавета і пошты, падштурхнуў мяне зрабіць нечаканую, можна сказаць, неверагодную выснову. У гэтым дапамагла мне «Карта зонаў глыбінных разломаў зямной кары», змешчаная ў «Звяздзе» за 19 жніўня 1994 года з адпаведным каментарыем У. Хількевіча.

Калі б гэтую старонку газеты не захаваў я ў сваім архіве (збіраю публікацыі аб незвычайных, цікавых анамальных з'явах, здарэннях, фактах), то, магчыма, і не ўспомніў бы зараз аб прачытаным амаль 14 гадоў таму.

Але аб усім па парадку. На памяць прыйшлі былыя перуны, што адбываліся менавіта на нашай сядзібе. У дзяцінстве мама расказвала, як маланка ледзь не забіла нашага бацьку. Калі ён спяшаўся схавацца ад навальніцы пад родны дах, літаральна за тры крокі перад ім маланка сіганула ў зямлю. Страшэнны гарматны выбух аглушыў бацьку, не на жарт спалохаў яго. Калі пасля яны агледзелі тое месца, то ўбачылі ямку з аплаўленай зямлёй.

Другі выпадак запомніўся ўжо мне, сямігадоваму. З суседнім хлопцам Ясеям гулялі мы ў хаце. Прыйшоў тады «на сяло» сусед Антон, да імя якога вяскоўцы дадавалі «Дваранін». У маладосці ён апынуўся ў Пецярбургу. І калі потым у яго галаве адбыліся негатыўныя зрухі (магчыма, гэта — вынік геапатагеннага ўплыву на яго псіхіку), Антон стаў лічыць сябе дваранінам. Так і «прыліпла» да яго гэта мянушка.

А мама ў гэты час завіхалася на дварышчы. Нечакана пайшоў дождж як з вядра. І раптам мы пачулі моцны выбух над нашай хатай. Мы з сябрам са страху схаваліся пад ложак. Калі потым зірнулі на Антона, ён, спалоханы, сядзеў на табурэтцы і нешта шаптаў.

Тут прыбягае збянтэжаная мама. Яна і пракаментавала выпадак, які адбыўся на яе вачах. Аказваецца, пярун ударыў у асвер драўлянага калодзежа. Маланка прабегла па гэтай жэрдцы аж да самага нізу. Прычэпленае акаванае жалезным абручом драўлянае вядро закалыхалася і бразнулася на брук. Маланкай адарвала тоўсты металічны крук. Зірнула мама на саламяны дах, а на ім мноства шчэпак. Выйшлі мы з Ясем на двор. На жэрдцы ўбачылі свежыя паглыбленыя шрамы, быццам хтосьці далатом пашкрабаў яе. Давялося потым прычапіць новы асвер, замацаваць вядро.

Трэці выпадак — зноў на маёй памяці. Ранкам, у летнюю спякоту, пастух пратрубіў на вуліцы, каб гаспадыні выганялі кароў на пашу. Вось-вось узыдзе сонца. Але неўзабаве найшло навальнічнае воблака. Пачуліся грымоты. І зусім блізка ад хаты — страшэннай сілы гром.

На вуліцы хтосьці крыкнуў: «Марыля, загарэлася ваша лазня! Пажар!»

Хуценька збегліся суседзі, сталі яго тушыць. Мужчыны бусакамі сцягнулі на зямлю палаючую саламяную страху. Хутка патушылі яе, а таксама верх сцен лазні, якую пабудаваў наш бацька.

Гэту маланку прыцягнуў, мауляў, высокі шэст антэны дэтэктарнага радыёпрыёмніка, якую недалёка ад лазні паставіў сусед. Да такой высновы прыйшлі мужыкі. Але ці толькі антэна справакавала пярун?

Калі неяк пад раніцу я асэнсаваў такія незвычайныя паводзіны Бога навальніцы Перуна, то нечакана прыйшоў да раскрыцця прычын узнікнення гэтых анамалій на сядзібе маёй бацькаўшчыны. Справа ў тым, што разрады паміж наэлектрызаваным навальнічным воблакам і зямлёй выстраіліся ў адну лінію — з поўдня на поўнач. І што цікава: маланкі Перуна прайшліся ўздоўж хаты з заходняга боку, і ніводная з іх не нарабіла вялікай бяды. Вось толькі крыху было клопатаў з лазняй, пабудаванай воддаль ад хаты ў 1947 годзе, на самым крайнім «маршруце» гэтых чатырох перуноў.

На жаль, потым не спытаўся я ў мамы, ці памятае яна штосьці яшчэ пра маланкі на нашай сядзібе. Мо расказвалі ёй што-небудзь з даўнейшых часоў? Магчыма, і да гэтага здараліся падобныя «прыцэльныя стрэлы» Бога навальніцы? Думаю цяпер, што такія дзіўныя здарэнні — не выпадковасць, а заканамернасць гэтай прыроднай з'явы, звязанай з геапатагеннай зонай аднаго з глыбінных разломаў зямной кары. А карта менавіта і сведчыць аб тым, што адзін з такіх разломаў якраз і перасякае нашу Ваўкалатку ў самым крайнім сваім павароце на паўночны захад, у бок г. Паставы.

**Казімір ЛУБНЕЎСКІ,**
*г. Вілейка.*

## ІНВЕСТЫЦЫІ: СУСВЕТНЫ РЭКОРД І НЯПЭЎНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

**Спецыялісты Канферэнцыі ААН па гандлі і развіцці (ЮНКТАД) падвялі вынікі глабальнай інвестыцыйнай дзейнасці ў мінулым годзе і былі прыемна здзіўлены.**

Аказалася, што аб'ём прамых іншаземных інвестыцый (ПІІ) у 2007 годзе дасягнуў рэкорднага ўзроўню і склаў 1,5 трыльёна долараў ЗША. І гэта на фоне крэдытна-фінансавага крызісу, які пачаў набіраць абароты ў ЗША ў другой палове 2007 года. Рэкорду ў значнай ступені садзейнічаў рост транснацыянальных карпарацый і адносна высокая дынаміка эканамічных паказчыкаў у многіх рэгіёнах свету.

Аналітыкі таксама вызначылі галоўныя накірункі глабальнага руху інвестыцый. Яны, дарэчы, як і апошнія чатыры гады, у асноўным «выбіралі» развітыя краіны. Так, ЗША, нягледзячы на ўсе іх эканамічныя непрыемнасці, захавалі за сабой першае месца ў адпаведным міжнародным рэйтынгу і летась атрымалі самыя буйныя прамыя іншаземныя інвестыцыі. Еўрапейскі Саюз здолеў прыцягнуць у 2007 годзе амаль 40 працэнтаў усяго аб'ёму сусветных ПІІ.

Плыні інвестыцый не абмінулі краіны Паўднёва-Усходняй Еўропы і былых рэспублік Савецкага Саюза. Паказчык ПІІ там вырас на 41 працэнт і дасягнуў рэкорднай лічбы ў 98 млрд долараў ЗША. У прыватнасці, штогод растуць аб'ёмы прамых іншаземных інвестыцый у эканоміку Беларусі. Менавіта на гэтыя грошы мяркуецца ўзводзіць шмат прэстыжных аб'ектаў у Мінску ў бліжэйшыя гады.

Летась сваю вялікую долю інвестыцый атрымалі краіны Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна — 126 млрд долараў ЗША. Сярод іх вылучыліся Бразілія, Чылі і Мексіка. Яны здолелі падвоіць лічбу ПІІ ў параўнанні з 2006 годам. Таксама прыцягнуць велізарныя інвестыцыі пашчасціла краінам Паўднёвай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі — 224 млрд долараў ЗША. Гэта таксама іх новы рэкорд.

Аднак спецыялісты ЮНКТАД праяўляюць асцярожнасць і стрыманасць пры ацэнках перспектыў глабальнага руху інвестыцый у 2008 годзе. Яно і зразумела: невядома чым закончыцца справакаваны іпатэчным крызісам у ЗША глабальны плацежны дысбаланс. Дадайце сюды рэзкія ваганні курсаў валют, высокі і нестабільны кошт энерганосьбітаў, рост цэнаў на прадукты харчавання, небяспечны інфляцыйны ціск у многіх краінах і г.д.

**Леанід ТУГАРЫН.**




## Аўтаінфарм

### ФОТА НА ПАМЯЦЬ

**З нядаўняга часу ў працэдуру праходжання тэхагляду на айчынных станцыях дыягностыкі ўведзена абавязковая фотафіксацыя.**

Кожны аўтамабіль фіксуецца электроннай фатакамерай, а яго здымак неўзабаве трапляе ў камп'ютарны архіў. Паводле тлумачэнняў Мінтранса, падобная мера ўведзена «ў мэтах узмацнення працы па барацьбе з карупцыйнымі праявамі». З пачатку года фота на памяць падчас праходжання тэхагляду робяць ужо на 183 станцыях дыягностыкі. А ўсяго ў Беларусі дзейнічаюць 185 станцый, якія праводзяць тэхнічны агляд транспартных сродкаў.

### «РАЗМЫТНЁЎКА» НЕ ЗМЕНІЦЦА

**У бліжэйшы час у Беларусі не плануецца павышэння ставак мытных пошлін на ўвоз патрыманых легкавых аўтамабіляў.**

Такую заяву падчас нядаўняй сустрэчы з журналістамі зрабіў начальнік упраўлення тарыфнага рэгулявання і мытных плацяжоў Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) Сяргей Полудзень. Паводле яго слоў, адпаведныя дакументы ў ДМК не паступалі. Прадстаўнік мытні адзначыў, што нават калі ў нашай краіне будзе больш імкліва развівацца зборачная вытворчасць легкавікоў, то стымуляванне такіх прадпрыемстваў будзе ажыццяўляцца «праз іншыя рычагі», а не шляхам павышэння «размытнёўкі».

## Аўтабяспека

### СЦЕРАЖЫЦЕ «ЖЫГУЛІ»

Аўтамабіль «Жыгулі» карыстаецца найбольшай папулярнасцю ў мінскіх зладзеяў. Паводле звестак ГУУС Мінгарвыканкама, летась было зарэгістравана 162 выпадкі ўгону машын памянёнай маркі. На другім месцы ў гэтым «рэйтынгу» значацца аўтамабілі «Volkswagen»: 50 фактаў угону. «Бронза» ў «Масквіча». Гэты транспартны сродак у Мінску летась станавіўся здабычай угоншчыкаў 23 разы. Увогуле, за мінулы год у сталіцы было зафіксавана 402 факты крадзяжу і ўгону аўтамабіляў, што на 151 выпадак менш, чым у 2006 годзе.

### ПАПЯРОВАЯ «ПРЫНАДА»

**У Маскве апошнім часам вельмі частымі сталі ўгоны аўтамабіляў з дапамогай... ліста паперы.**

Робіцца гэта наступным чынам. Як толькі кіроўца сядае за руль, зладзеі незаўважна чапляюць на заднюю шкло ліст чыстай паперы. Гаспадар машыны заўважае пабочны прадмет звычайна ўжо пасля таго, як завядзе рухавік. Убачыўшы ліст, ён, не заглушыўшы рухавік, выходзіць з машыны, каб зняць «перашкоду». А ў гэты момант зладзеі садзяцца за руль і знікаюць.

## Аўтарэйтынг

### «PORSCHE» — ЛЕПШЫ

**Нямецкае агенцтва па кантролі за якасцю (TUV) правяло амаль 7 мільёнаў праверак 194 аўтамабіляў і склала рэйтынг самых надзейных патрыманых машын.**

Такім чынам у катэгорыі «самых малодшых» (аўтамабілі ад 2 да 3 гадоў) найменш дэфектаў і нараканняў спажыўцоў у «Mazda 3», лепшым сярод чатырох- і пяцігадовых прызнаны «Porsche 911» (гэтая ж мадэль першынствавала і ў «групе» ад 8 да 9 гадаў, а таксама ад 10 да 11 гадоў), сярод шасці- і сямігодак — «Toyota RAV4».

## Аўтадаследаванне

### ЦІШЭЙ ЕДЗЕШ — БОЛЬШ НАШКОДЗІШ

**«Ляжачыя паліцэйскія» наносяць шкоду экалогіі.**

Да такой высновы прыйшлі эксперты Брытанскай аўтамабільнай асацыяцыі. Спецыялісты правялі даследаванне і прыйшлі да высновы, што на ўчастках дарог, абсталяваных «ляжачымі паліцэйскімі», узровень забруджвання навакольнага асяроддзя павышаецца на 10 працэнтаў. Справа ў тым, што перад памянёнымі штучнымі перашкодамі кіроўцы вымушаны змяншаць хуткасць, што аўтаматычна прыводзіць да павелічэння расходу паліва амаль у 2 разы і большы выкід шкодных рэчываў.

## Аўтапрам

### СЕРЫЙНАЯ «SIBER»

З 28 сакавіка гэтага года на Горкаўскім аўтазаводзе распачнецца серыйны выпуск легкавога аўтамабіля «Siber». Ён спраектаваны на аснове амерыканскага «Chrysler Sebring». Усяго сёлета плануецца выпусціць больш за 20 тысяч расійска-амерыканскіх «сібіракоў», аснашчаных рухавікамі 2,4 і 2,7 літра. Кошт аднаго такога аўто ў залежнасці камплектацыі складзе ад 18 тысяч да 25 тысяч долараў.

## Аўтажарт

*П'яны мужчына вяртаецца позна ноччу дамоў і гаворыць жонцы:*

*— Я пакінуў сёння нашу машыну на вуліцы.*

*— А чаму ты не паставіў яе ў гараж?*

*— На вуліцы была такая цемра, што я ніяк не мог сабраць дэталі.*

# Конкурс «Пекін-2008»

## Адказы на пытанні IV тура

1. Упершыню выступаючы на Алімпійскіх гульнях, баскетбалісты Кітая сваю адзіную перамогу ў 4 матчах атрымалі над камандай Францыі — 45:38. Адказ № 4.
2. Спартсмены Кітая заваявалі больш за ўсё залатых медалёў на Алімпійскіх гульнях 1984 года — 5 з 15 — у гімнастыцы. Адказ № 1.
3. Максімальна магчымым складам спартсмены Беларусі заваявалі права выступіць на Алімпійскіх гульнях у Пекіне ў гімнастыцы мастацкай і цяжкай атлетыцы. Адказ № 3.
4. Алімпійскі чэмпіён Камандар Маджыдаў нарадзіўся ў грузінскім горадзе Дманісі. Адказ № 3.
5. Віктар Рэнейскі з'яўляецца 8-разовым чэмпіёнам свету. Адказ № 4.
6. Беларускі сабліст Віктар Сідзяк, выступаючы за зборную СССР, заваяваў званне чэмпіёна ў індывідуальных спаборніцтвах на Алімпіядзе 1972 года, атрымаўшы ў фінальным турніры 4 перамогі ў 5 баях. У фінальным турніры шасці лепшых ён уступіў толькі Уладзіміру Назлымаву (СССР). Адказ № 4.
7. Беларускі алімпійскі чэмпіён Валерый Шарый нарадзіўся ў Чэрвені. Адказ № 5.
8. Першы ўраджэнец Беларусі, які заваяваў алімпійскі медаль, Караль Румель удзельнічаў у II Сусветнай вайне і закончыў яе ў званні падпалкоўніка. Адказ № 3.
9. На Алімпійскіх гульнях 2004 года ў складзе мужчынскай баскетбольнай зборнай Кітая найбольшы час на пляцоўцы ў сярэднім за матч правёў YAO Ming. Адказ № 4.
10. У Мінску ў матчы 1/4 фіналу футбольнага турніру Алімпіяды-1980 гулялі каманды Югаславіі і Алжыра. Адказ № 5.

## Адказы на пытанні V тура

1. Самым узроставым алімпійскім чэмпіёнам па боксе з'яўляецца Рычард Ган (Вялікабрытанія), які перамог на Алімпійскіх гульнях 1908 года ва ўзросце 37 гадоў. Адказ № 1.
2. У мужчынскай вольнай барацьбе спартсмены Кітая не заваявалі медалі на чэмпіянаце свету. Адказ № 5.
3. Першым 4 медалі на Алімпійскіх гульнях у спаборніцтвах па водным пола заваяваў бельгіец Жозэф Плецінк. Ён стаў прызёрам на Гульнях 1908, 1912, 1920 і 1924 гг. Адказ № 4.
4. Алімпійскія чэмпіёны Леанід Гейштар і Сяргей Макаранка ўзнагароджаны ордэнам «Знак пашаны». Адказ № 1.
5. Алімпійская чэмпіёнка Антаніна Кошаль вырасла ў Смалявічах. Адказ № 5.
6. Фехтавальшчыку Віктару Сідзяку траўму вока на Алімпійскіх гульнях 1972 года нанёс італьянец Мікеле Мафеі. Адказ № 4.
7. Алімпійскім чэмпіёнам па валейболе і пляжным валейболе з'яўляецца амерыканец Чарлз Кіралі. Адказ № 1.
8. У фінальным матчы Алімпіяды 1992 года па баскетболе ў складзе жаночай зборнай Кітая самай рэзультатыўнай (12 ачкоў) была Li Dongmei. Адказ № 2.
9. Даўжыня цяжкаатлетычнай штангі складае 220 см. Адказ № 2.
10. Міжнародным алімпійскім камітэтам прызнана Міжнародная федэрацыя нетбола. Адказ № 2.

## Юныя знаўцы спорту выйгралі паездку на Алімпіяду

**У трэці раз у Беларусі быў праведзены рэспубліканскі конкурс для юных знаўцаў спорту алімпійскага руху. Хлопцам і дзяўчатам ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў патрэбна было ведаць англійскую мову, адказаць на пытанні, якія друкаваліся ў выданнях, у тым ліку і ў «Звяздзе», і пажадана займацца спортам. Да ўдзелу дапускаліся ўсе ахвотныя. Такіх набралася звыш 3 тысяч чалавек. Свае лісты дасылалі не толькі беларусы, але і расіяне.**

Конкурс «Пекін-2008» праводзіўся з 1 верасня па 31 снежня мінулага года ў пяць тураў з мэтай прапаганды спорту і здаровага ладу жыцця. Яго пераможцамі сталі Дар'я Кавалёва з Мінска і Уладзіслаў Пятрухін з Віцебска. Менавіта яны і паедуць у маладзёжны лагер у сталіцы летняй Алімпіяды-2008, дзе збяруцца 400 юнакоў і дзяўчат з краін — удзельніц Гульняў у Кітаі. Іншым лаўрэатам учора таксама былі ўручаны прызы ў Нацыянальным алімпійскім камітэце — лічбавыя фотаапараты, мабільныя тэлефоны, наборы посуду, веласіпеды. Цікава, што сярод тых, хто амаль наблізіўся да пераможцы па колькасці правільных адказаў, быў і гамяльчанін Аляксандр Аржахоўскі, брат хлопца, які пабываў у лагеры «Афіны-2004».

**Ірына ПРЫМАК.**

## Уладзімір КОЦУР:

# «АРЫЕНЦІР НАШАГА КАЛЕКТЫВУ — ПАДВОІЦЬ АБ'ЁМЫ ВЫПУСКУ ПРАДУКЦЫІ ПРЫ ПАЛЯПШЭННІ ЯЕ ЯКАСЦІ»

### Творчая брыгада «Звязды» пабывала на прыватным унітарным прадпрыемстве «Рэчыца малако»

**— Уладзімір Фёдаравіч, мы ведаем, што ваша прадпрыемства неаднаразова выпрабоўвалася на трываласць, што яно падвяргалася рэарганізацыі з мэтай больш эфектыўнай работы, аднак да пэўнага часу, калі можна так сказаць, толку ад гэтага было мала. Якая ваша думка па ўказаным пытанні?**

— Я не хачу крытыкаваць сваіх папярэднікаў-кіраўнікоў, іншых начальнікаў розных ведамстваў, бо ўпэўнены, што яны не хацелі мець несуцяшальныя вынікі сваёй работы, а працавалі ў меру сваіх здольнасцяў і магчымасцяў. Каб атрымалася лепш, таму, відаць, і праводзілася рэарганізацыя прадпрыемства. Канкрэтна: спачатку наш малочны завод быў самастойным у сваёй дзейнасці, затым яго далучылі да Хойніцкага сыраробнага камбіната і на гэтай аснове было створана адкрытае акцыянернае таварыства «Рэчыцкія малочныя прадукты». Затым прадпрыемства ўвайшло ў склад адкрытага акцыянернага таварыства «Малочныя прадукты» (г. Гомель) з вылучэннем яго ў прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Рэчыца малако». Тое ж самае было і з утварэннем ПУП «Палескія сыры».

**— І вось вы прыйшлі на завод у якасці яго кіраўніка. Якое было адчуванне ў першы час ад становішча спраў?**

— Не самае лепшае, прызнаюся. Прадпрыемства вядзе сваю біяграфію з 1954 года, і тэхнічнае пераўзбраенне яго было зроблена толькі ў 1994 годзе, калі ў рэспубліцы пасля развалу Савецкага Саюза адчуваліся вялікія цяжкасці. Паступова яны змяншаліся паўсюдна, у тым ліку і на нашым малочным, аднак, не так, як хацелася. Уявіце сабе, што сярэдняя зарплата тады па прадпрыемстве (а гэта быў 2005 год) складала ўсяго 270 тысяч рублёў. Многіх работнікаў гэта, вядома, не задавальняла, таму рабочых не хапала. Тэхнічная аснашчанасць завода не адпавядала задачам таго перыяду, не было ніводнага новага малакавоза, ніводнага новага аўтафургона. Аб тым, што меліся сур'ёзныя фінансавыя праблемы, ужо і гаворкі няма, як і пра тое, што трэба было неадкладна наладжваць як вытворчую, так і тэхналагічную дысцыпліну. І гэтак далей, і да таго падобнае.



## ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

**Ураджэнец Рэчыцкага раёна, з якім звязана ўся яго біяграфія. Пасля школы закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію па спецыяльнасці заінжынер. Працоўная дзейнасць Уладзіміра Фёдаравіча пачалася з пасады намесніка дырэктара саўгаса «Баршчоўка», дзе ён набыў пэўны вопыт работы кіраўніка, што пасля адыграла вялікую ролю ў прызначэнні на іншыя высокія пасады: дырэктар вучэбнай гаспадаркі прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 178, дырэктар Рэчыцкага знешгандлю, дырэктар Рэчыцкага малочнага завода.**

**Дырэктарскі стаж Коцура складае ўжо восем гадоў, у тым ліку — тры гады на вышэйуказаным прадпрыемстве, якое зараз называецца «Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Рэчыца малако», і якое, як гаворыцца, сёння знаходзіцца на пад'ёме, упэўнена бярэ намечаныя рубяжы.**

**— Не прыйшла, калі гаварыць шчыра, Уладзімір Фёдаравіч, у галаву думка такога кшталту: куды трапіў, навошта мне ўсё гэта?**

— Не, не прыйшла. Бо ведаў, на што ішоў, калі са мной вялі гутарку ў райвыканкаме, і верыў, што ўсё выправіцца, калі толькі працаваць, працаваць і працаваць, не адступацца ад пастаўленай мэты. Бо касцяк калектыву — здаровы, і большасць спецыялістаў на сваім месцы, добра ведаюць справу. Гэтак жа, як і рабочыя, якія маюць немалы вопыт.

**— Забягаючы наперад, спытаем: а што — сёння? Якія паказчыкі для параўнання?**

— Сёння сітуацыя зусім іншая. Пачну з таго, што другі год запар мы працуем ужо з прыбыткамі, што выконваем усе прагнозныя паказчыкі. Пазалетась сярэдняя зарплата была 411 тысяч рублёў, летась 645 тысяч. Рост відавочны, стабільнасці ў заробках людзей дабіліся. Таму ў іх зусім іншы настрой, нацэленасць на плённую работу. У калектыве сёння 128 чалавек, і сярэдні ўзрост персаналу — каля сарака гадоў. Ніякага скарачэння яго мы не плануем на дадзеным этапе. Наадварот, у нас задума: пашырэнне аб'ёмаў вытворчасці ў два разы з захаваннем рабочых месцаў.



Злева направа: інжынер-тэхнолаг Святлана ДАВЫДЗЕНКА, начальнік вытворчасці Валянціна ЛАСІЦА, намеснік дырэктара па вытворчасці Аляксандр ШАБАНАЎ.



**— У два разы? Смелая задума. А ці рэальная яна?**

— Рэальная, рэальная. Самае галоўнае, каб мы верылі ў яе, і тады ўсё атрымаецца. Тут я павінен сказаць, што самае цяжкае ў нас ужо ў мінулым, бо тое адставанне, якое мела месца раней, пераадолена. З дапамогай мясцовых уладаў мы наладжвалі справы з кадрамі, дысцыплінай, тэхнічнай аснашчанасцю і шмат з чым іншым. Тут я хачу адзначыць той факт, што калі ў вышэйпамянёным 1994 годзе тэхнічнае пераўзбраенне закончылася на тым, што завод перайшоў ад фасоўкі натуральнамалочнай прадукцыі ў шкляную бутэльку на фасоўку ў плёначныя пакеты, дык зараз гэты накірунак мы лічым неперспектыўным.

**— А ў чым вы бачыце перспектыву?**

— У фасоўцы яе ў пластмасавыя ёмістасці: ПЭТ-бутэлькі, тэтрапакі і тэтрабрыкі. Для гэтага пачалі ўжо тэхнічнае перааснашчэнне вытворчасці ў вялікіх маштабах. Дастаткова сказаць, напрыклад, што інвестыцыі ў 2007 годзе ў вытворчасць прадпрыемства склалі 2400 мільёнаў рублёў, і яны былі накіраваны на закуп новага самага сучаснага абсталявання. Прычым гэта ўжо не адзінкавыя высокапрадукцыйныя агрэгаты, а цэлыя тэхналагічныя лініі, што сведчыць аб больш глабальным падыходзе да вырашэння нашых задач.

**— Што вы маеце на ўвазе?**

— Ды хоць бы тое, што ўказанае пераўзбраенне мы пачалі, як гаворыцца, з самых вытокаў вытворчага працэсу. А менавіта, з устаноўкі самага сучаснага наста прыёмкі малака ад гаспадарак і комплексу для цеплавой апрацоўкі гатовага прадукту праз аўтаматызаваныя працэсы, і будзем гэты накірунак вытрымліваць далей у плане набыцця сучаснага абсталявання для ўпакоўкі гатовага прадукту.

**— Аб гэтым, Уладзімір Фёдаравіч, калі ласка, больш падрабязна.**

— Год таму мы аб'явілі тэндар на закупку новай тэхнікі, і ў ім удзельнічала многа прадпрыемстваў, у тым ліку і замежных. Выйграла яго італьянская кампанія «Фраутэч», умовы якой нас цалкам задаволілі. Я паехаў туды ў камандзіроўку і ўпэўніўся, які кампактны ўнікальны комплекс мы можам мець у сябе замест маральна і фізічна зношанай тэхнікі расійскай вытворчасці, якая працавала ў нас многія гады і была вельмі энергаёмістай. А тут — аўтаматызацыя, так званае зніжэнне ўплыву чалавечага фактара ў вытворчым працэсе (бо робаты працуюць, як кажуць, на ўсе сто, больш дакладна, чым чалавек), паляпшэнне якасці прадукцыі, значнае павелічэнне яе выпуску за адзін і той жа час.

Італьянцы шэраг работ на нашым прадпрыемстве ўжо выканалі, а менавіта, зрабілі расстаноўку абсталявання, а мы сёння падводзім да яго камунікацыі. Чарговы іх прыезд адбудзецца ў канцы лютага, і тады новая лінія будзе ўведзена ў строй дзеючых. Мы спадзяёмся, што ў другім квартале яна ўжо ўвойдзе ў нармальны рэжым работы.

**— Якія віды прадукцыі выпускае ваш калектыў?**

— Мы спецыялізуемся на вырабе натуральнамалочнай прадукцыі і мяккіх сыроў. Гэта — кефір, малако, ёгурты, смятана і да таго падобнае, усяго каля трыццаці відаў іх. Летась мы атрымалі ганаровы дыплом на рэспубліканскай выставе «Белгуст» за сваю прадукцыю, сёлета — таксама, чым і ганарымся.

**— А дзе рэалізуецца ваша малочная смаката?**

— У Рэчыцы, Гомелі, Мінску, Гомельскай вобласці. Мы абслугоўваем сёння каля ста гандлёвых арганізацый. Таксама нашымі партнёрамі, пастаўшчыкамі малочнай сыравіны з'яўляюцца сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Рэчыцкага раёна. І з работнікамі гандлю, і з хлебаробамі адносіны нармальныя, мы заўсёды ідзём насустрач адзін аднаму.

Хачу яшчэ сказаць пра тое, што сёння прадпрыемства мае магчымасць набіраць кадры патрэбныя, а не проста тых, хто сюды захоча прыйсці працаваць. Гэта дыктуе час, бо, скажам, каб як след абслугоўваць самае сучаснае абсталяванне (а яго ў нас будзе ўсё больш і больш), патрэбны кваліфікаваныя спецыялісты. Нездарма ж мы нядаўна прынялі на работу інжынера, які не толькі добра ведае сваю справу кіравання тэхналагічным працэсам вышэйпамянёнага ўнікальнага комплексу, але і валодае дзвюма замежнымі мовамі.

Наогул жа калектывам прадпрыемства я задаволены. У ім добра спалучаецца вопыт старэйшых і энтузіязм маладых работнікаў, і ўсё гэта грунтуецца на іх высокай адказнасці за даручаную справу. Асабліва хацеў бы адзначыць старанне галоўнага інжынера Любові Арэшчанкі, якая ўзнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, электраманцёраў Сяргея Ратнікава, Паўла Блішча, машыніста аміячна-халадзільнай устаноўкі Аляксея Ліхадзіеўскага, начальніка вытворчай лабараторыі Любові Цімашэнкі, эканаміста Таццяны Рубін, галоўнага бухгалтара Таццяны Северынай, інжынера-метролага Андрэя Сіроткі, зменнага майстра Алены Сямковай, інжынера-радыёлага Раісы Пранузы, вадзіцеляў Васіля Ганчарэнкі і Міхаіла Навуменкі, грузчыка Васіля Пісарэнкі, экспедытараў Сяргея Рамашкі і Віктара Ганчарова. Ды ўсіх ці пералічыш? З такім калектывам мы здольныя ўзяць новыя вышыні.

## КУРС — НА МАДЭРНІЗАЦЫЮ



Галоўны інжынер прадпрыемства Любоў АРЭШЧАНКА правяла нас па цэхах, азнаёміла з вытворчасцю. На прыёмным участку сыравіны яна засяродзіла ўвагу на тым, што малако сюды паступае для перапрацоўкі ад дзевяці гаспадарак раёна. Калі ў 2006 годзе яго было прынята 18 880 тон, дык летась ужо 23 113, што на 22 працэнты больш. Праектная ж магутнасць прадпрыемства — 140 тон у суткі. Але столькі сыравіны перапрацаваць калектыў не ў стане, бо абсталяванне, як ужо гаварыў Уладзімір Фёдаравіч Коцур, было маральна і фізічна састарэлым і не спраўлялася з такімі аб'ёмамі. На парадак дня паўстала пытанне: як развівацца далей, як прывесці ў дзеянне нявыкарыстаныя рэзервы?

Таму і ўзяты быў курс на мадэрнізацыю вытворчасці, для чаго першапачаткова абнавілі фасовачнае абсталяванне. Малапрадукцыйныя іжэўскія аўтаматы былі заменены на аўтаматы адной санкт-пецярбургскай фірмы, якія за адну хвіліну напаўняюць малаком ці кефірам 35—45 поліэтыленавых пакетаў. Адначасова з гэтым удалося пазбавіцца ад няшчыльнасці швоў у іх пры зварцы, з-за чаго бывалі выпадкі працякання малака.

Наступны этап — забяспечыць хуткую прыёмку малочнай сыравіны, ачысціць яе і зрабіць цеплавую апрацоўку, што вельмі важна для паскарэння тэхналагічных працэсаў і павышэння якасці прадукцыі. Для гэтага і было закуплена тое італьянскае абсталяванне. Вузел прыёмкі, дарэчы, мае прадукцыйнасць 25 тон за адну гадзіну. Вялікая ўвага, гаворыць Любоў Паўлаўна, была ўдзелена эканоміі энергарэсурсаў, для чаго шэраг камер былі пераведзены на фрэонавае ахаладжэнне і былі выведзены з работы рассольны выпарнік і аміячны кампрэсар, што ў цэлым садзейнічала дасягненню такога паказчыка: летась каэфіцыент энергазберажэння склаў мінус 33 пры даведзеным заданні мінус 13.

Цяпер мы працуем над тэхнічным пераўзбраеннем аміячнай кампрэсарнай, і сёлета запланавалі замяніць у кацельні энергаёмістыя катлы на больш эканамічныя. Наступны наш крок — набыць сучасную тэхналагічную лінію для вырабу масла метадам пераўтварэння высокатлустых вяршкоў, якія запланавана пасля перапрацоўкі малочнай сыравіны, гаворыць галоўны інжынер. З устаноўкай такой лініі знізіцца сабекошт масла, і прадпрыемства будзе мець магчымасць перапрацоўваць сыравіны больш, чым зараз.

**ПУП «Рэчыца малако» запрашае зацікаўленых суб'ектаў гаспадарання для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.**
247500 г. Рэчыца, Гомельская вобласць
тэл. 2 29 09, факс 2 21 18. УНП 490420528

## КАНТРОЛЬ — ПАЎСЮДНЫ



Так сказала інжынер-мікрабіёлаг вытворчай лабараторыі прадпрыемства Ірына Глазава. І гэта не проста словы, а рэальнасць. Бо галоўны клопат калектыву — выраб такой прадукцыі, якая б адпавядала самым высокім патрабаванням спажыўцоў. За гэтым пільна сочаць работнікі лабараторыі, якія і праводзяць сваю палітыку ў галіне якасці. Калі гаварыць коратка, у чым яна заключаецца, дык гэта: не дапускаць парушэнняў патрабаванняў стандартызацыі і метралогіі, для чаго і павінны ствараць ўмовы на ўсіх працэсах. І яны ёсць, гэтыя ўмовы, бо нездарма ж на прадпрыемстве ўкаранёна і сертыфікавана сістэма менеджменту якасці прымяняльна да вытворчасці натуральнамалочнай прадукцыі і мяккіх сыроў у адпаведнасці з патрабаваннямі расійскіх стандартаў ISO 9001—2001.

У складзе вытворчай лабараторыі — сыравінная, радыялагічная, мікрабіялагічная лабараторыі і лабараторыя фізіка-тэхнічных аналізаў. Работнікі іх і стаяць на варце якасці як сыравіны, якая паступае з гаспадарак, так і гатовага прадукту, які адпраўляецца ў гандлёвую сетку. Гэты кантроль бесперапынны, ён праводзіцца кожны дзень. І тым самым забяспечваецца поспех, спажыўцам падабаецца прадукцыя прадпрыемства, бо яна — на любы густ.

**Матэрыял падрыхтавалі Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ, Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**
**Фота Алены ЛУГІНІНАЙ.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.59 | 16.47 | 8.48 |
| Віцебск — | 7.54 | 16.32 | 8.38 |
| Магілёў — | 7.50 | 16.37 | 8.47 |
| Гомель — | 7.41 | 16.39 | 8.58 |
| Гродна — | 8.13 | 17.03 | 8.50 |
| Брэст — | 8.08 | 17.10 | 9.02 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 30 студзеня—6 лютага.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

**Пр.** *Марыі, Апанаса, Кірылы, Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра;*
**К.** *Яны, Людзвіга, Марцэліны, Людвіка, Пятра, Яна.*




## Анталогія беларускай песні

# Падаюць сняжынкі

Паэтычны малюнак кранае выяўленнем пяшчотнай замілаванасці роднымі краявідамі, духоўнай злітнасці з навакольнай прасторай. Кампазітар актывізаваў перадачу душэўнай несупакоенасці. У мастацкі тэкст песні, у аснову якой пакладзены пачатак паэмы «Дзесяты падмурак» Паўлюка Труса, ён увёў прыпеў — і тым самым узмацніў дынамізм пачуццёвых парыванняў.

Ігар Лучанок надзелены народным па светаўспрыманні талентам. Ён тонка адчувае меладыйнасць беларускай прасторы, вечную цягу яе насельнікаў да гарманічнага паяднання. І ў песнях кампазітар разнастайна адлюстраваў гэты прыродастваральны рух, напоўніў іх высакароднай энергіяй і сумесна з «Песнярамі» актыўна пашырыў яе.

**Міхась ШАВЫРКІН.**

**Тэкст Паўлюка ТРУСА** **Музыка Ігара ЛУЧАНКА**

*1. Падаюць сняжынкі — дыяменты-росы,*
*Падаюць бялюткі за маім акном...*
*Расчасалі вішні шоўкавыя косы*
*І ўранілі долу снегавы вянок.*

*Дзесьці ў прасторы празвінелі бомы,*
*Дацвілі пялёсткі нечае тугі...*
*І здаецца зноўку еду я дадому*
*Пераведаць родных, блізкіх, дарагіх.*

***Прыпеў:***
*Хочацца навеяць казкі-таямніцы*
*Гукамі мелодый, радасцю без слоў.*
*І застылі цені у маёй святліцы,*
*Засынаю... сніцца роднае сяло.*

*2. Адхінае вечар тонкія мярэжы,*
*На акне альвасы дагарэлі ў сне.*
*А ў душы кляцістасць і такая свежасць,*
*І з вачэй усмешкі сыплюцца на снег.*

***Прыпеў.***

*3. А сняжынкі сеюць кволую імглістасць,*
*Падаюць бялюткі за маім акном,*
*І цвіце на вішнях снежная ўрачыстасць,*
*Сцелецца на скронях*
*перад ранні́м сном.*

*Зноў зіма паслала снежныя кілімы,*
*Зажурыла беллю паплавы, лугі,*
*І прыходзіць радасць у красе маўклівай.*
*Адплываюць хвалі смутку і тугі.*

***Прыпеў.***




## Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой зарослая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81* **№ 2 (253)**

### Дачныя падказкі

■ Некаторыя расліны, пасаджаныя каля кустоў парэчак і агрэсту, прыцягваюць насякомых-драпежнікаў, якія знішчаюць шкоднікаў.

■ У кветак, агародных і пладовых культур з аднаго сямейства — агульныя шкоднікі і агульныя хваробы. Значыць, агульныя і лекі. Тое, што карысна для цыбулі, карысна і для лілеі, цюльпана, нарцыса.

■ Не пакідайце на парэчках галінкі, якім больш за 5—6 гадоў. Яны не даюць ураджаю, затое на іх прывольна адчуваць сябе многія шкоднікі і хваробы.

■ Пры перапрышчэпцы костачкавых культур несумяшчальнасць праяўляецца часцей, чым пры перапрышчэпцы семачкавых. На вішні звычайнай і чарэшні добра ўдаюцца прышчэпкі вішні і чарэшні. Сліва і алыча добра растуць і пладаносяць пры прышчэпцы ў крону дрэў алычы, чарнасліву, слівы і войлачнай вішні.

### Карысна ведаць

■ Па ўтрыманні соляў кальцыю бацвінне рэпы з'яўляецца рэкардсменам сярод прадстаўнікоў агародніны. Таму лісце рэпы ў свежым выглядзе шырока выкарыстоўваецца ў зялёных салатах, а сок з лісця рэпы з дабаўленнем маркоўнага — лепшы сродак для людзей, якія пакутуюць ад захворванняў зубоў, асабліва карыесу.

■ Каб падоўжыць усходжасць кветкавага насення, яго рэкамендуецца захоўваць пры паніжанай тэмпературы, напрыклад, у халадзільніку. У звычайных умовах захоўвання хутка губляецца ўсходжасць насення аднагадовых астраў і шматгадовых дэльфініумаў.

■ Як бы вам ні падабаўся той ці іншы гатунак бульбы, пастаянна вырошчваць толькі яго на дачным участку, г. зн. зацыклівацца на адным і тым жа гатунку не варта, у халоднае лета можна застацца без ураджаю. Лепш вырошчваць на ўчастку гатункі розных груп спеласці.

■ У невялікім пладасховішчы нельга амаль адразу знізіць тэмпературу да 1—3 градусаў і давесці вільготнасць паветра да 80—90 працэнтаў. Для гэтага трэба рабіць частыя праветрыванні сховішча ў начны час. У адваротным выпадку працэсы дыхання пладоў узмацняцца, іх якасць паступова пачне пагаршацца.

### Залаты вус — хатні доктар

***«Нядаўна суседка сказала, што ёсць вельмі каштоўная лекавая пакаёвая расліна, якой можна лячыць многія хваробы, і называецца гэта расліна залаты вус. Што гэта за расліна і што яна лечыць?»***

**Марыя Іванаўна,** *г. Мінск*

Пра гэту расліну газета пісала неаднойчы, расказваючы пра яе лекавыя якасці, але калі хтосьці прапусціў гэтыя публікацыі, то мы нашадаем пра якасці пра каштоўнай расліны.

У народнай медыцыне залаты вус часта называць хатнім доктарам. Калі вы нічога не чулі пра залаты вус, то, магчыма, вам вядома іншая народная назва, а іх у гэтай пакаёвай расліны мноства: далёкаўсходні вус, кітайскі вус, японскі вус, жывы волас, венерын волас, хатні жэньшэнь. Называюць яго яшчэ «кукурузкай», таму што знешне расліна падобна на маладую кукурузу.

Залаты вус (яе батанічная назва калізія духмяная), адносіцца да сямейства камеліёнавых, якія налічваюць каля 50 родаў і 500 відаў раслін, з якіх самая вядомая — традэсканцыя. Радзіма калізіі — Паўднёвая Амерыка. Таму лацінская назва расліны дзіхарызандра. Паводле слоў народнага лекара-гамеапата з Варонежа Уладзіміра Агаркава, гэта расліна — найлепшы сродак для лячэння **хранічнага панкрэатыту**, яна таксама добра падаўляе патагенную мікрафлору, здымае болі, аднаўляе **функцыю падстраўнікавай залозы**, **селязёнкі, кары наднырачнікаў**. Знімае **запаленне жоўцевага пухіра і жоўцевых шляхоў, страўніка, тонкага кішэчніка**. Нармалізуе кіслотнашчалачны састаў страўнікава-кішачнага тракту, **выводзіць шлакі з арганізма, валодае высокімі імунастымулюючымі ўласцівасцямі**. Аб бактэрыцыдных уласцівасцях залатога вуса сведчыць той факт, што настой і адвар гэтай расліны не закісаюць на працягу некалькіх тыдняў пры захоўванні ў цёплым памяшканні.

Разбаўляе макроту, **здымае ацёк слізістых абалонак бронхаў у астматыкаў**, што рэзка паляпшае агульны стан хворых і часта прыводзіць да поўнага вылечвання ад бранхіяльнай астмы. Залаты вус не толькі дэзінфікуе паветра ў памяшканні, але і выдзяляе рэчывы, якія садзейнічаюць вылечванню захворванняў дыхальнай сістэмы. Таму гаршчок з раслінай добра паставіць ля ложка хворага на лёгкія.

**Сок** расліны валодае высокімі раназагойвальнымі ўласцівасцямі, у сувязі з чым яго часам называюць жывой вадой. Добра лечыць захворванні скуры: **лішаі, язвы**. Прэпараты залатога вуса часта прымяняюць пры **алергічных высыпках**, праціраючы ўчасткі паражонай скуры ватным тампонам, змочаным у настоі ці адвары расліны.

Для **лячэння апёкаў і абмаражэнняў** выкарыстоўваюць расцёртыя лісты і парасткі залатога вуса. Кашку з лісця і парасткаў кладуць на складзеную ўдвая марлю і прыкладваюць да апечанага (абмарожанага) участка скуры (марляй да пашкоджанай паверхні). Павязку мяняюць праз кожныя 8—10 гадзін.

У нетрадыцыйнай медыцыне для лячэння гіпертанічнай хваробы прымяняюцца **настойка** і **адвар** залатага вуса. Зразумела, хворыя на гіпертанію павінны знаходзіцца пад **назіраннем** лечачага ўрача і прымаць прапісаныя ім прэпараты. Аднак народныя сродкі, у тым ліку сродкі з залатога вуса, дапамагаюць узмацніць эфектыўнасць лячэння.



Для аднаўлення **мазгавога кровазвароту пры інсульце** рэкамендуецца прымаць па 1 чайнай лыжцы адвару залатога вуса 3 разы на дзень за 30—40 хвілін да яды. Курс лячэння — 28 дзён.

Пры **парадантозе** рэкамендуецца прыкладваць 1 раз на дзень на 20 хвілін да хворых дзясен свежы ліст залатога вуса. Лячэнне праводзяць на працягу 7 дзён.

Пры прыгатаванні **настойкі** выкарыстоўваюць лісце расліны даўжынёй не менш як 20 см. 1 ліст кладуць у шкляны ці керамічны посуд , заліваюць 1 л кіпеню і настойваюць на працягу 24 гадзін. Затым настой працэджваюць, пераліваюць у цёмны шкляны посуд і захоўваюць у халаднаватым месцы.

Для прыгатавання **адвару**, які выкарыстоўваецца для лячэння захворванняў печані і страўнікава-кішачнага тракту, а таксама для вывядзення шлакаў з арганізма, выкарыстоўваюць усе зялёныя часткі расліны.

**Рэцэпт 1.** Лісце і сцёблы здрабняюць, кладуць у эмаліраваны посуд, заліваюць халоднай вадой, даводзяць да кіпення (але не кіпяцяць) і пакідаюць на 6—7 гадзін. Затым адвар працэджваюць, пераліваюць у цёмную шкляную ёмістасць і захоўваюць у халаднаватым месцы.

**Рэцэпт 2.** 20—30 каленцаў расліны здрабняюць, заліваюць гарачай вадой, даводзяць да кіпення (але не кіпяцяць) і пакідаюць на 10 гадзін. Потым дзейнічаюць як у першым выпадку.

Моцны **насмарк** лечаць паравымі інгаляцыямі з 2 кроплямі эўкаліптавага масла і 3 кроплямі масла залатога вуса. Пры **вострым бранхіце** на вобласць грудзей робяць кампрэс з сумесі 100 г цёплага мёду і 1 сталовай лыжкі здробненых лісцяў залатога вуса. Для хранічнага бранхіту 1—2 разы на тыдзень грудзі змазваюць маззю, прыгатаванай на аснове ўнутранага жывёльнага сала з дабаўленнем соку залатога вуса. Для **масажу** хворых суставаў рэкамендуецца выкарыстоўваць масла залатога вуса.

Трэба таксама памятаць, што панацэі на свеце не існуе, ніводны медыкаментозны і ніводны народны сродак часта не можа гарантаваць поўнага вылечвання. Кожны чалавечы арганізм індывідуальны і патрабуе індывідуальнага падыходу.

## 31 студзеня

**Дзве даты**



**1128 год** — 880 гадоў таму ў пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца горад Гродна (летапісны Горадня, Гарадзень). У Іпацьеўскім летапісе называецца цэнтрам Гарадзенскага княства. З 1376 года — валоданне князя Вітаўта, пры якім Гродна стаў другой сталіцай ВКЛ; у 1496 годзе горад атрымаў магдэбургскае права. У 1576—86 гадах — рэзідэнцыя караля Стэфана Баторыя. У 1793 годзе на сейме ў Гродне зацверджаны другі падзел Рэчы Паспалітай, а 23 лютага 1795 года апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў у гродзенскім Новым замку акт адмаўлення ад трона.

**1839 год** — англійскі фізік Джон Толбат у Лонданскім каралеўскім таварыстве зрабіў даклад аб адкрыцці ім працэсу фатаграфіі.

**Цытата дня:**

***«Пра жанчын заўсёды знойдзецца сказаць што-небудзь новае, пакуль хоць адна з іх застанецца на зямным шары».***

**Жан дэ Буфлер (1737—1815), французскі палітычны дзеяч, пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

**Рамантыкі — гэта людзі, у якіх каханне бывае часцей, чым сэкс.**

☺

У бюро для пахаванняў.
— Па якім разрадзе вы жадалі б зрабіць пахаванне?
— Па самым танным, чацвёртым.
— А вы ведаеце, што па гэтым разрадзе вянкі нясе сам нябожчык?

☺

**Студэнт! Не спазняйся на лекцыі — будзеш сядзець у першым радзе!**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 543. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12